Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. АЎТОРАК

№ 121 (30001)

ПРАФЕСІЯ — АБАРАНЯЦЬ РАДЗІМУ

2

РУКАПІСНЫЯ КНІГІ БЕЛАРУСКІХ ТАТАР

11

Ураджай-2023

ПА БУЛЬБЕ І АГАРОДНІНЕ СТРАТ НЕ НАЗІРАЕЦЦА

Аб сітуацыі на палях карэспандэнту БелТА расказаў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль ЯДЛОЎСКІ.

«Ападкі крыху палепшылі сітуацыю на палях. Аднак на збожжавыя і рапс гэта практычна ніяк не паўплывала, паколькі цяпер ідзе завяршэнне фарміравання ўраджаю. Адзначу, што ў выпадку недабору аб'ёмаў збожжа яго можна будзе дакупіць у іншых краін, таму тут праблем не будзе. Пры гэтым ападкі яшчэ ўплываюць на прадукцыйнасць траў, кукурузы і іншых тэхнічных культур», — сказаў Васіль Ядлоўскі.

Паводле яго слоў, уборка траў першага ўкосу ўжо завяршаецца і пачата ўборка другога ўкосу. На 25 чэрвеня другім укосам убрана 45 тыс. тон у Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцях.

«У сувязі з тым, што прадукцыйнасць траў з-за недахопу вільгаці меншая, чым у мінулым годзе, аб'ёмы нарыхтоўкі крыху ніжэйшыя. Разам з тым у мэтах нівеліравання недабору травяных кармоў прадугледжана пэўная работа. У першую чаргу ідзе сяўба прамежкавых культур. На гэты момант пасеяна ўжо 42 тыс. га, а ў мінулым годзе было 18 тыс.га. Пры гэтым тэмпы з кожным днём нарастаюць», — падкрэсліў намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення раслінаводства Мінсельгасхарча.

Акрамя таго, ён дадаў, што ідзе бяспакрыўная сяўба траў (высяванне толькі шматгадовых траў. — **«Зв.»**) і яе аб'ёмы ў гэтым годзе ў два разы большыя, чым у мінулым.

«Па агародніннych і кармавых культурах, а таксама па бульбе страт не назіраецца. Іх стан не выклікае вялікіх апасенняў. Усё будзе залежаць ад таго, як далей будуць складвацца ўмовы надвор'я», — рэзюмаваў Васіль Ядлоўскі.

• Мовай лічбаў

У цэлым па краіне травы першага ўкосу скошаны на 1331,4 тыс. га, што складае 100,1 працэнта ад плана. У Віцебскай вобласці першы ўкос праведзены на 91,4 працэнта запланаваных плошчаў, а Магілёўскай — 95,3 працэнта. У Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях першы ўкос траў ужо завершаны.

Травы другога ўкосу скошаны на 70,2 тыс. га. У Брэсцкай вобласці першы ўкос праведзены на 29,7 тыс. га, Віцебскай — 0,79 тыс. га, Гомельскай — 4,05 тыс. га, Гродзенскай — 8,67 тыс. га, Мінскай — 25,7 тыс. га і Магілёўскай — 1,32 тыс. га.

Травы ўбраны з 1286,6 тыс. га, што складае 96,6 працэнта да скошанага. Пашкоджаных засухай пасеваў збожжавых на корм убрана з 22,3 тыс. га плошчаў. Нарыхтавана 215,3 тыс. т сена — 22,4 працэнта да плана, 5786,3 тыс. т сенажу — 42,3 працэнта (у тым ліку ў палімерную ўпакоўку 160,8 тыс. т), 48,5 тыс. т зернесенажу і 169,7 тыс. т сіласу — 0,88 працэнта.

Усяго ў гэтым годзе плануецца атрымаць 9,6 млн тон адзінак травяных кармоў. Да гэтага часу нарыхтавана 18,4 працэнта ад плана. Сіласу плануецца нарыхтаваць амаль 19,2 млн т, сенажу — 13,7 млн т (у тым ліку ў палімернае пакаванне 1 млн т), сена — 962,1 тысячы.

ЗМЕНА НА ЗЕЛЕНАЛУЖСКАЙ ЛІНІІ

На станцыі «Аэрадромная», якая будуецца на трэцяй лініі сталічнага метро, вядуцца плануавыя работы. На гэтым фота мантажнік сувязі Яўген ЦІШКЕВІЧ працягвае кабель гучнага апавяшчэння. Дзякуючы яму ў свой час на новай станцыі загучыць: «Паважаныя пасажыры...»

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ГЛАЗ, прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў:

«Ніхто не імкнецца замяніць Алімпійскія гульні. Усе жадаюць вяртання алімпійскага руху ў звычайнае рэчышча. Пра гэта гавораць спартсмены. Рэдкія галасы высокапастаўленых спартыўных функцыянераў пачынаюць гучаць аб тым, што алімпійскі рух павінен такім і заставацца. Алімпійскія гульні павінны быць аб'ядноўваннем, а не раз'ядноўваннем. Ніякіх альтэрнатыў ім арганізатары II Гульняў краін СНД стварацъ не спрабуюць, але ў цяперашніх умовах можна казаць аб тым, што ў гэтых спаборніцтвах вялікія перспектывы. Гэта ўсяго толькі Другія Гульні, а водзік ужо вялікі. З году ў год колькасць удзельнікаў расце, спаборніцтвы будуць набіраць прэстыж. У гэтым няма сумневаў. СНД займае палову кантынента».

З нагоды

СВЯТОЧНЫ МАРАФОН ДЛЯ ВІЦЕБСКА

Паўночная сталіца з 23 да 26 чэрвеня адзначала 1049-годдзе і 79-ю гадавіну вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Што цікавага для жыхароў і гасцей Падзвіння падрыхтавалі арганізатары і якімі новымі аб'ектамі папоўнілася інфраструктура горада?

Старт марафону падзей дало ўрачыстае адкрыццё манументальна-дэкаратыўнай скульптуры «Віцебск гістарычны» каля абласнога краязнаўчага музея. Работа над мініяцюрнай картай горада на Дзвіне канца XIX — пачатку XX стагоддзя вялася з другой паловы 2022 года скульптарам Сяргеем Сотнікавам, і пры пільным разглядзе бронзавы горад ураджае рэалістычнасцю і дэталёвасцю. Карта горада размясцілася на валуне. Па ідэі майстра, гэты арт-аб'ект павінен стаць адпраўным пунктам для экскурсій па гістарычным цэнтры горада.

СТАР. 3

Нерухомасць

ТУТ БЫЎ І ПАЛАЦ, І БРОВАР...

Турыстычны цэнтр на месцы піўзавода прыме наведвальнікаў налета

Паўгода таму пачалася рэканструкцыя адзнаго з самых буйных гістарычных аб'ектаў Гродна. Доўгі час комплекс будынкаў у самым цэнтры горада пуставаў і паступова разбураўся. І хоць былі спробы яго аднавіць, але справа не краналася з месца. Некалькі гадоў таму прыватная кампанія ў рамках СЭЗ «Гроднаінвест» прыступіла да маштабнай работы. Пасля таго як праект быў зацверджаны, сюды прыйшлі будаўнікі.

ЧЫМ ЁН ЗНАКАМІТЫ?

Па праўдзе сказаць, аб'ект даволі доўга мазоліў вочы сваім выглядам. Яго амаль немагчыма абмінуць — кожны, хто праязджае па Старым мосце праз Нёман, бачыць гэтыя абшарпаныя будынкі, часткова схаваныя пад сеткамі і тэнтамі. Здавалася, такому відовішчу не будзе канца. Далей — яшчэ больш. Пасля няўдалых аўкцыёнаў тут адбыўся пажар — згарэў дах самага старажытнага аб'екта — былога палаца. Праўда, дах гарадскія ўлады аднавілі, але жадаючых набыць аб'ект не знайшлося.

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

КНДР папярэдзіла, што Карэйскі паўвостраў блізкі да «мяжы ядзернай вайны»

ЗША і Паўднёвая Карэя давялі напружанасць на Карэйскім паўвостраве да максімальнага ўзроўню, паведаміла інфармагенцтва «Рэнхап» са спасылкай на МЗС КНДР. «Ваяўнічыя дзеянні ЗША падштурхнулі ваенную напружанасць на Карэйскім паўвостраве і ў Паўночна-Усходняй Азіі, якія ўжо паглыбіліся ў вельмі нестабільную сітуацыю, блізкую да мяжы ядзернай вайны», — паведамілі ў міністэрстве. У даследчай справаздачы Інстытута амерыканскіх даследаванняў МЗС КНДР ваенная напружанасць на Карэйскім паўвостраве і ў Паўночна-Усходняй Азіі парайноўваецца з ноччу перад пачаткам Карэйскай вайны 1950—1953 гадоў, а ЗША і Паўднёвая Карэя абвінавачваюцца ў «вар'яцкай антыкамуністычнай ваеннай канфрантацыі» і «рытарычных пагрозах». У даследаванні змяшчаецца папярэджанне, што напружанне на паўвостраве «хутка перарасце ў сусветную і тэрмаядзерную вайну, беспрэцэдэнтную для свету» і прывядзе «да самых катастрафічных і незваротных наступстваў» для міру і стабільнасці.

Рэйтынг урада Японіі абрынуўся на 15 працэнтаў

Узровень падтрымкі кабінета прэм'ер-міністра Японіі Фуміа Кісіды за месяц знізіўся з 56 да 41 працэнта. Пра гэта сведчаць даныя апытання, праведзенага газетай Yomiuri, паведаміла ТАСС. У сваю чаргу ўзровень неўхвалення дзейнасці кабміна павялічыўся з 33 да 44 працэнтаў. Адзначаецца, што найбольшую незадаволенасць рэспандэнтаў выклікалі праблемы, якія ўзніклі пры аб'яднанні ў адной карце функцый пасведчання асобы і медыцынскага страхавання. У апошнія тыдні ў краіне ўзніклі шматлікія скандалы, звязаныя з уцечкамі асабістых даных і немагчымасцю аплаціць за кошт страхоўкі медыцынскія паслугі. У сувязі з гэтым 67 працэнтаў апытаных заявілі, што лічаць недастатковымі дзеянні кабміна па ўрэгуляванні адпаведных праблем. Як адзначае газета Nikkei, у выніку былі парушаны планы Кісіды правесці датэрміновыя ўсеагульныя выбары і тым самым умацаваць пазіцыі кіруючай Лібэральна-дэмакратычнай партыі. Паводле звестак выдання, 43 працэнты японцаў не лічаць, што кіраўнік урада павінен зараз распусціць парламент для правядзення выбараў.

У ЗША ўпаў у раку цягнік, які перавозіў гарачы асфальт і расплаўленую серу

У выніку крушэння моста ў штаце Мантана ў раку Елаўстоўн упалі вагоны грузавога цягніка, які перавозіў небяспечныя грузы, паведаміла The New York Times. Па словах афіцыйных асоб, гаворка ідзе пра тры вагоны з гарачым асфальтам і чатыры вагоны з расплаўленай серай. У экстраннай службе акругі Стыльуотэр заявілі, што абодва разлітыя рэчывы хутка застываюць у вадзе. Такім чынам, патэнцыяльнае шкоднае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе можа быць мінімізавана, асабліва калі будзе абмежавана яго распаўсюджванне. Улады прынялі рашэнне перакрыць раку ніжэй па цячэнні, каб прадухіліць пападанне змесіва цыстэрнаў на найбліжэйшыя сельскагаспадарчыя палеткі. У акрузе Елаўстоўн, дзе пражываюць каля 167 тысяч жыхароў, на час перакрылі забор вады. Аналагічныя меры былі прыняты і на водаачышчальных збудаваннях у акрузе Стыльуотэр, дзе пражываюць каля 9 тысяч чалавек.

КОРАТКА

• Сярэдняя зарплата ў Беларусі ў маі склала Вг1861,1.

• **Беларускі цукар упершыню прададзены ў Малдову праз біржу.**

• ЦТ па беларускай мове на 100 балаў напісалі 16 абітурыентаў.

• **Да канца года ў 17 лясгасах укаранеяць аўтаматызаванае відэаназіранне за лясныміпажарамі.**

• Доля тавараў з Рэспублікі Беларусь на гандлёвых пляцоўках Расіі за 2022 год выраслa ўдвая — да 25 %.

• **Больш за 2 тысячы спартсменаў з 18 краін прайшлі акрэдытацыю для ўдзелу ў II Гульнях краін СНД.**

• Навучальны збор з ваеннаабавязанымі тэрытарыяльных войскаў правядуць у Салігорскім раёне.

Клімат

ГЛАБАЛЬНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ НЯЎХІЛЬНА НАБЛІЖАЕЦЦА

Што нас чакае ўжо заўтра і як паспяхова да гэтага падрыхтавацца?

Сёлета ў нас быў досыць дажджлівы красавік, але засушлівыя май і чэрвень. Як вядома, на клімат уплываюць прамысловасць і аўтатранспарт, а ад рэзкай змены клімату пакутуюць лясная і сельская гаспадаркі. Кваліфікаваныя спікеры з розных міністэрстваў і ведамстваў абмеркавалі гэтыя пытанні падчас круглага стала ў БелТА на тэму «Уплыў кліматычных змяненняў на надвор'язалежныя галіны эканомікі».

Фота Віталя ВАНЬКОВІЧА.

ПАРНІКОВЫЯ ГАЗЫ — ЗІМОЙ, АЭРАЗОЛІ — ЛЕТАМ

«Уклад нашай краіны ў агульнасусветныя выкіды парніковых газаў параўнальна невялікі — 0,2 %, але нават гэтую велічыню варта ўлічваць, — адзначыў **дырэктар Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі Сяргей ЛЫСЕНКА**. — На рост тэмпературу ў летні перыяд уплываюць у асноўным аэразолі і сонечная радыяцыя. Парніковыя газы аказваюць уплыў у зімовы перыяд».

СТАР. 9

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА «Да чытача з любоўю!»

Заканчваецца падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙСЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Падзея

ПРАФЕСІЯ — АБАРАНЯЦЬ РАДЗІМУ

На плошчы Дзяржаўнага сцяга адбыўся ўрачысты выпуск афіцэраў Акадэміі МУС

Каля 400 лейтэнантаў у найбліжэйшы час папоўняць шэрагі органаў унутраных спраў, Міністэрства абароны, Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта і Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Сярод выпускніковў гэтага года — 37 курсантаў, якія скончылі галоўную міліцэйскую ВНУ краіну з адзнакай, 12 з іх угнараваны залатым медалём. Акрама таго, ёсць выпускнікі, якія ўключаны ў рэспубліканскі банк даных адораных моладзі. Гэта шэсць юных даследчыкаў, адзначаных спецыяльным фондам Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Нямала сярод наваспечаных афіцэраў і прадаўжальнікаў міліцэйскіх дынастый.

Адным з першых выпускніковў Акадэміі МУС павіншаваў **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.** Ён адзначыў, што гэты дзень з'яўляецца знакавым не толькі для Міністэрства ўнутраных спраў, але і ў цэлым для краіны. «Сістэма забеспячэння нацыянальнай бяспекі папоўнілася яшчэ адным атрадам — афіцэрскім атрадам, які будзе садзейнічаць абароне нацыянальных інтарэсаў у забеспячэнні правапарадку, — падкрэсліў дзяржсакратар Савета бяспекі. — Самае галоўнае — краіна, народ чакае ад вас годнага выканання тых задач, якія ўскладаюцца на вас, на вашы афіцэрскія пагоны. Прафесарска-выкладчыцкі склад, кіраўніцтва акадэміі, кіраўніцтва факультэтаў, курсаў зрабіла ўсё магчымае, каб укласці ў вас веды, якімі валодаюць яны. Астатняе — за вамі».

Аляксандр Вальфовіч звярнуў увагу на тое, што ваенна-палітычная абстаноўка вельмі складаная. «Сёння архітэктура міжнародная бяспекі трашчыць па швах, на жаль, — удакладніў ён. — Ідзе сур'ёзнае процідзеянне паміж Усходам і Захадам, а Беларусь знаходзіцца ў эпіцэнтры гэтай буры. Унутрыпалітычная абстаноўка нашай краіны ў многім залежыць ад таго, як наша сістэма забяспечвае правапарадак. Вы — аснова, ядро таго складніка ўнутры краіны і абавязаны забяспечыць правапарадак. Народ чакае таго, што ў нашай краіне будуць і надалей панаваць бяспека і мір. Гэта шмат у чым залежыць ад вас, вашых прафесійных навыкаў».

Звяртаючыся да выпускніковў, **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ** нагадаў, што на час іх вучобы ў акадэміі выпалі няпростыя часы. «І цяжкі 2020 год, калі вы сумяшчалі вучобу ў акадэміі і службу на ахове грамадскага парадку, — удакладніў ён. — Вы годна, нягледзячы на сваю маладосць, сумесна з калегамі з Міністэрства ўнутраных спраў выканалі свой абавязак, забяспечылі бяспеку грамадзян».

Кіраўнік міліцэйскага ведамства пажадаў наваспечаным афіцэрам памятаць сяброўства, якое зарадзілася ў сценах акадэміі, і кабы яны шанавалі сваіх выкладчыкаў, якія не проста далі ім тэарэтычныя веды, а ўклалі душу і зрабілі ўсё для таго, каб курсанты прайшлі гэты службовы шлях годна. «Пасля невялікага адпачынку вы ўсе прыйдзеце ў практычныя падраздзяленні і будзеце несці службу па ахове грамадскага парадку, па забеспячэнні бяспекі нашых грамадзян, — канстатаваў міністр. — Вам прыйдзецца забяспечваць іх бяспеку ў нялёгкіх умовах, раскрываць найскладанейшыя злачынствы. Але з вамі заўсёды будуць побач надзейныя сябры, старэйшыя таварышы і настаўнікі, якія заўсёды вам падкажуць і дапамогуць, бо наша беларуская міліцыя моцная менавіта карпаратыўнасцю і згуртаванасцю».

Іван Кубракоў нагадаў, што ў працэсе сваёй дзейнасці маладым лейтэнантам давядзецца размаўляць з людзьмі, якія нашмат старэйшыя за іх. «Я хачу, каб вы разумелі, што часам ад вашых рашэнняў залежыць лёс і жыццё чалавека, і каб, прымаючы іх, вы заўсёды кіраваліся законам», — пажадаў міністр унутраных спраў і выказаў удзячнасць бацькам выпускніковў, асабліва мамам. Па словах кіраўніка ведамства, іх дзеці выбралі няпростую прафесію — абараняць Радзіму — і робяць гэта якасна.

У бацькоў і родных выпускніковў, якія прыйшлі падтрымаць лейтэнантаў, — асаблівы настрой. Пачуццё гонару, якое таты і мамы адчуваюць за сваіх ужо дарослых сыноў і дачок, — тое, што ў гэты ўрачысты дзень немагчыма схавець.

Як прызналася **мама выпускніка Марына КЛІМЕНКА,** паступленне ў Акадэмію МУС у свой час было асабістым і абдуманым рашэннем сына. «Мой сын — мой гонар, — кажа жанчына. — Нават крыху сумна ад таго, што вучоба ўжо скончылася. Напярэдзе — нялёгкі шлях. Цяпер сын нясе адказнасць не толькі за сябе і сваю работу, але і ў цэлым за краіну».

Звяртаючыся да выпускніковў, **начальнік Акадэміі МУС Аляксандр ВАСІЛЬЕЎ** адзначыў, што наперадзе ў афіцэраў — доўгі шлях, поўны планаў, перамог і здзяйсненняў. «Вам трэба будзе паспяхова праявіць сябе ў паўсядзённай практычнай дзейнасці, рэалізаваць свае ўменні і здольнасці, каб у наступным стаць сапраўдзівымі прафесіяналамі ў абранай справе, — паставіў задачу начальнік ВНУ. — Спадзяюся, што вы здолееце засвоіць традыцыі і неацэнны досвед, назапашаны папярэднімі пакаленнямі афіцэрскага корпуса нашай Радзімы, і прымножыць іх. З гонарам і добрай якасцю нясіце званне выпускніка Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, імкніцеся быць узорам для саслужыўцаў, прымяняйце свае веды ў імя законнасці і справядлівасці».

Як заўважылі выпускніцы міліцэйскай ВНУ, тое, што яны гадамі спасцігалі ў сценах акадэміі, абавязкова спатрэбіцца ім у іх паўсядзённай дзейнасці. Арына Корбан і Таццяна Якімчык будуць служыць у папраўчых установах Дэпартамента выканання пакарання. Цяжкасцяў дзяўчаты не баяцца: за гады вучобы ў акадэміі яны прызвычаіліся выконваць задачы нароўні з хлопцамі. Па іх словах, служба — гэта прызванне, а таму яны абавязкова спрабуюць са сваімі абавязкамі — так, як належыць сапраўднаму афіцэру.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Створана розумам

ВЫНАХОДНІЦТВЫ І ПРАМЫСЛОВЫЯ ЎЗОРЫ

Ахова, камерцыялізацыя і інтэграцыя інтэлектуальнай уласнасці на еўразійскай прасторы

Аўтарскае права, прамысловыя ўзоры, абмежаванне выключных правоў, стварэнне адзінага патэнтнага суда. Гэтыя і іншыя тэмы абмяркоўваліся на традыцыйным штогадовым семінары, які Еўразійская патэнтная арганізацыя ладзіць у адной з дзяржаў — удзельніц ЕАЭС і які сёлета прайшоў у Нясвіжы. Удзельнікі казалі пра неабходнасць высокай якасці экспертызы заявак, якія падаюцца, абмяркоўвалі патрэбу ў канкрэтных формах узаемадзеяння экспертаў на еўразійскай прасторы паміж сабой, пытанні камерцыялізацыі інтэлектуальнай уласнасці (ІУ) і неабходнасць стварэння яе новых аб'ектаў. Закраналі і неабходнасць адысці ад існуючых бар'ераў тэрытарыяльнай аховы аб'ектаў ІУ паміж краінамі — удзельніцамі ЕАЭС, каб стварыць агульны рынак са свабодным перамяшчэннем тавараў, паслуг і капіталаў з адзіным гандлёвым знакам і адзінай карыснай мадэллю на ўсёй еўразійскай прасторы.

Канкурэнтаздольнасць — у тэхналогіях і з улікам нацыянальных інтарэсаў

Сёння складана ўявіць хаця б адну сферу жыцця, якую б ні праціналі пытанні інтэлектуальнай уласнасці, і тэхналагічны суверэнітэт заязі нельга разглядаць асобна ад іх, пераканана **Лілія ГУМЕРАВА, старшыня камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу РФ па навуцы, адукацыі і культуры:**

— Вельмі важна, каб нашы дзяржавы аб'ядноўваліся не толькі для абмену практыкай і вывучэння вопыту, але і для вырашэння канкрэтных задач. Найперш камерцыялізацыі вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці, найхутчэйшага іх укаранення ў гаспадарчую дзейнасць, жыццё, перадавыя навуковыя распрацоўкі, развіццё інстытута патэнтных павераных.

На фоне сучасных выклікаў — пандэміі і санкцый — на тэрыторыі Еўразіі эканамічныя, культурныя і фінансавыя стасункі значна ўзмацніліся, і на гэта павінна адгукнуцца інтэлектуальная ўласнасць. Еўразійскія палітычныя арганізацыі ставяць задачы новай прамысловай кааперацыі, сумеснай вытворчасці, адзначыў **Грыгорый ІЎЛІЕЎ, прэзідэнт Еўразійскага патэнтнага ведамства:**

— Гаворка ідзе пра транспартныя калідоры, інфраструктуру. Усе гэтыя пытанні павінны вырашацца з улікам магчымасцяў інтэлектуальнай уласнасці, яе метадаў і механізмаў, таму што вырашыць глабальныя пытанні, якія будуць распаўсюджвацца на значную частку свету, можна толькі тады, калі зняты пытанні інтэлектуальнай уласнасці і калі да вырашэння эканамічных пытанняў далучана інтэлектуальная ўласнасць.

Ён падкрэсліў важнасць ІТ-узаемадзеяння экспертаў у сферы інтэлектуальнай уласнасці, дадаўшы, што ўсе дасягненні, якія маюць нацыянальныя ведамствы Еўразійскай патэнтнай арганізацыі, павінны стаць дасягненнем усіх нацыянальных ведамстваў. Еўразійская патэнтная арганізацыя пры гэтым гатовая фінансаваць перадачу тэхналогій ад аднаго ведамства да другога.

Стварэнне сістэмы аховы інтэлектуальнай уласнасці — ключавы этап у развіцці міжрэгіянальных адносін, які ва ўмовах інтэграцыі Еўразійскай патэнтнай сістэмы становіцца ўсё больш запатрабаваным. Необходна сканцэнтравацца на стварэнні новых інструментаў аховы сваіх распрацовак і ўдасканаленні ўжо існуючых. Гэта дазволіць еўразійскай сістэме быць больш эфектыўнай, лічыць **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей ШЛЫЧКОЎ:**

— Ахова непасрэдна вынаходак прамысловага ўзору — формула, якая забяспечвае знешнюю і ўнутраную абарону любой тэхналогіі. Магчымасць паўнавартаснай абароны сваіх распрацовак — важны стымул для стварэння любой прадукцыі. Канкурэнтаздольнасць любой дзяржавы цяпер вызначаецца найперш узроўнем існуючых у краіне тэхналогій.

Інтэлектуальная уласнасць сёння — міжгаліновы фактар, які ахоплівае пытанні эканомікі, сацыяльнай сферы, навукі, культуры і іншых сфер, упэўнены **Уладзімір РАБАВОЛАЎ, генеральны дырэктар Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці:**

— Беларускі бок падтрымлівае ініцыятывы Еўразійскага патэнтнага ведамства па ўдасканаленні сістэмы ІУ на тэрыторыі ЕАЭС. Вельмі важна адлюстраваць пытанні развіцця інтэлектуальных працэсаў на прасторы ЕАЭС, якія адбываюцца пад уздзеяннем знешніх фактараў. Назіраюцца сур'ёзныя геапалітычныя трансфармацыі, што закранаюць таксама і пытанні інтэлектуальнай уласнасці, якая павінна рэагаваць з улікам нацыянальных інтарэсаў краін-удзельніц і іх міжнародных абавязацельстваў. Трэба таксама ўлічваць пытанні ўнутранага развіцця і імпартазамяшчэння.

Камерцыялізацыя і геаграфічнае найменне

ІУ павінна стаць актывам, за які будзе змагацца бізнес, падкрэслілі ўдзельнікі семінара, абмяркоўваючы пытанні камерцыялізацыі інтэлектуальнай уласнасці. У прыватнасці, прынятыя ў Грамадзянскі кодэкс Расіі змены ўжо скіраваны на камерцыялізацыю вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці. А яшчэ ў Расіі з'явіўся новы аб'ект інтэлектуальных правоў — геаграфічнае найменне — абазначэнне, якое выкарыстоўваецца на тавары, што паходзяць з пэўнага рэгіёна і валодаюць уласцівасцямі, рэпутацыяй ці характэрнымі асаблівасцямі, то-бок гэткі рэгіянальны брэнд, падзялялася Лілія Гумерава. З іншага боку, прыйшлося пайсці на абмежаванне рэгістрацыі таварных знакаў, якія ўтрымліваюць назвы геаграфічных аб'ектаў на прадукцыі, што не мае дачынення да пэўнага рэгіёна. За апошнія тры гады ў Расіі было зарэгістравана 43 геаграфічныя найменні. У Беларусі ж дагэтуль зарэгістравана толькі тры геаграфічныя найменні: мінеральная вада «Мінская», «Лідскі квас» і «Лідскае піва». Гэтую тэму кіраўнікі беларускіх і расійскіх ведамстваў нават абмеркавалі ў межах семінара падчас асобнай рабочай сустрэчы.

— Каб бізнес быў зацікаўлены, недастаткова толькі прыняць законы, іх неабходна ўмела рэалізаваць, — заўважыла Лілія Гумерава. — Таму нацыянальныя патэнтныя ведамствы чакаюць вялікая работа. Для хутчэйшай інтэграцыі заканадаўстваў, магчыма, можна выкарыстаць механізм мадэльнай інтэграцыі.

Для росту колькасці патэнтаў і насычэння рынку таварамі

Удзельнікі агучылі, што колькасць патэнтаў, якія рэгіструюць вынаходнікі на свае здабыткі, у тым ліку створаныя на працоўным месцы, змяншаецца, і сітуацыю трэба мяняць. Не трэба забывацца на абарону не толькі вынаходніцтваў, але і прамысловых узораў. Гандлёвы знак і прамысловы знак — прадукты, якія дапамагаюць бізнесу і асабліва прывабныя для малых і сярэдніх вытворчасцяў, пераканаў **Іван БЛІЗНЕЦ, генеральны дырэктар выдавецкага дома «Інтэлектуальная ўласнасць»:**

— Рэгіструючы прамысловы ўзор у межах Еўразійскага патэнтнага ведамства, мы атрымліваем магчымасць развіцця рынку інтэлектуальнай уласнасці і пастаўкі абароненых тавараў, якія вырабляем у межах ЕЭАС. Гэтым мы павінны прыцягнуць нашых вынаходнікаў і павялічыць колькасць узораў, якія рэгіструюцца. А каб еўразійскі прамысловы ўзор быў яшчэ больш прывабны для бізнесу, варта было б стварыць і «дарожныя карты» для большай прадказальнасці развіцця інструмента прамысловых узораў.

У Кіргізіі дзеля павелічэння колькасці службовых вынаходніцтваў, дарэчы, іх аўтарам павялічылі памер узнагароджання (выплата адразу 10 або 20 зарплат), а работадаўцам узнялі памер адказнасці.

На семінары, у прыватнасці, прагучала ідэя стварэння адзінага патэнтнага суда ў межах Еўразійскага патэнтнага ведамства, што дазволіць хутка і інтэнсіўна разглядаць патэнтныя спрэчкі, у тым ліку з прыцягненнем механізмаў медыяцыі.

— Ва ўмовах санкцый Расія і Беларусь былі вымушаны самастойна прымаць надзвычайныя заканадаўчыя акты, скіраваныя на легалізацыю паралельнага імпарту тавараў за межамі вытворчасці, якія крытычна важныя для ўнутранага рынку, — падзялялася **Галіна ПАДРАЗЁНАК, першы намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў.**

Галоўнай мэтай стварэння рэгіянальнага механізму аховы і аховы правоў інтэлектуальнай уласнасці з'яўляецца фарміраванне і развіццё рынку ІУ, які стварае ўмовы для практычнага асваення і камерцыялізацыі аб'ектаў ІУ, развіцця інавацыйнага прадпрымальніцтва і, як вынік, павышэння канкурэнтаздольнасці тавараў вытворцаў у межах ЕАЭС.

Абмеркавалі эксперты таксама празмерную адказнасць за парушэнне выключных правоў, якая практыкуецца ў Расіі. А вось беларускі бок заўважыў, што пад уплывам санкцый у Беларусі прымененна вымушаная мера — да 31 снежня 2024 года дзейнічае спецыяльная пастанова, якая датычыцца абмежавання выключных правоў. Дзякуючы ёй Белтэлерадыёкампанія зможа забяспечыць айчыннага гледача музычным, спартыўным і іншым кантэнтам, атрымаць які ранейшым спосабам цяпер немагчыма.

У выніку, як адзначылі прысутныя, рэгіянальны семінар увабраў у сябе абмеркаванне самых розных напрамкаў развіцця інтэлектуальнай уласнасці: ад глабальных да прыкладных задач.

Ірына СІДАРОК,
фота аўтара.

Разам

Генетычны код славян праз пакаленні

Фестываль «Славянскае адзінства» ў Гомелі аб'яднаў розныя пакаленні жыхароў Гомельшчыны і Браншчыны. Свята культуры і традыцый прыгранічных рэгіёнаў сёлета прымеркавалі да Года міру і стваральнай працы. Насычаная праграма мерапрыемства распачалася богаслужэбным чынам у гомельскім кафедральным Свята-Петра-Паўлаўскім саборы. Пасля прадстаўнікі афіцыйных дэлегацый Гомельскай і Браншкай абласцей сустрэліся на плошчы Працы каля Вечнага агню: ушанавалі памяць савецкіх воінаў і падпольшчыкаў, усклалі вянкі і кветкі да брацкай магілы.

Ад гэтага знакавага для кожнага жыхара Гомельшчыны месца памяці жывой плынню ўдзельнікі фестывалю прайшлі па цэнтральных вуліцах абласнога цэнтра. Шэсце аб'ядналася розныя пакаленні брацкіх народаў і асабліва ўразіла сваёй маштабнасцю, яскравасцю сцягаў у колерах нацыянальных сімвалік Беларусі і Расіі. Дэлегацыі прайшлі ад плошчы Працы па Кіеўскім спуску да набярэжнай Сожа. Каля знакамітай гомельскай скульптуры першапасяленца-палянінчага «Лодачнік» разгарнулася гістарычная тэатральна-музычная рэканструкцыя.

Паўнавартасны бульвар славянскага сяброўства з самымі рознымі лакацыямі, падрыхтаванымі Гомельскай вобласцю і Браншчынай, разгарнуўся ўздоўж усёй цэнтральнай набярэжнай Сожа. Першымі гасцей фестывалю сустрэлі майстрыхі Бранскай вобласці, якія частавалі 20-метровым пірагом.

На бульвары славянскага сяброўства аб сваіх дасягненнях у эканоміцы, адукацыі, культуры праз разнастайныя экспазіцыі распавялі прадпрыемствы і ўстановы Гомельскай вобласці і Браншчыны. Госці і ўдзельнікі фестывалю знаёміліся з традыцыйнымі рамёствамі, майстрамі ўнікальных і самабытных традыцый: салома- і лозаплеценнем, бортніцтвам, ткацтвам, вышыўкай, разьбой па дрэве. Сустракалі гасцей фестывалю і інтэрактыўная пляцоўка «Служу Айчыне!», і спаборніцтва «Самы моцны славянін».

Максімальна карысна для творчага працэсу атмасферу свята выкарыстала моладзь Гомельскай вобласці і Браншчыны — навучэнцы каледжаў мастацтваў правялі пленэр на набярэжнай Сожа. Расійскія юныя мастакі пісалі з натуры партрэт дзяўчыны ў беларускім нацыянальным касцюме, гомельскія студэнты ўвасаблялі рускую прыгажуню.

Пунктам прыцягнення для моладзі стала работа маштабнай фестывальнай пляцоўкі для ўдзельнікаў міжнароднага маладзёжнага лагера «Сяброўства-2023». Студэнты прыгранічных рэгіёнаў змаглі звярнуцца і задаць любыя хвалюючыя пытанні прадстаўнікам афіцыйных дэлегацый: **старшыні Гомельскага аблвыканкама Івану КРУПКО і намесніку губернатара Бранскай вобласці Мікалаю СІМАНЕНКУ.** Сваё бачанне трох «кітоў» у аснове непарушнага славянскага адзінства на сустрэчы з моладдзю выказаў Іван Крупко.

— У першую чаргу гэта наша гістарычная мінулае, наша памяць і наша сучаснасць. А гэта актыўнае супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай і сацыяльна-культурнай сферы. І, вядома, наша мірная будучыня, якую нам стварацьразам, — падкрэсліў кіраўнік беларускага рэгіёна. — Вы наша надзея і наша будучыня і вам кіраваць краінай па розных напрамках праз некалькі гадоў. У гэтым таксама ёсць адзінства, — нагадаў маладому пакаленню старшыня Гомельскага аблвыканкама.

Дарэчы, на маладзёжнай фестывальнай пляцоўцы юнакі і дзяўчаты Гомельшчыны і Бранскай вобласці цікавіліся не толькі тэмамі супрацоўніцтва, агульных дасягненняў рэгіёнаў, але і пытаннямі з жыццёвага вопыту, успамінамі са студэнцкіх гадоў.

Асобную сустрэчу з беларускай і расійскай моладдзю ў межах фестывалю правёў расійскі палітычны і спартыўны дзеяч, дэпутат Дзяржаўнай думы Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Мікалай Валуеў.

Актыўнай удзельніцай сустрэч з моладдзю стала жыхарка Бранска — студэнтка філіяла Расійскай акадэміі народнай гаспадаркі і дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі Марыя Бабакова.

— У Беларусі я ў другі раз. Упершыню была сем гадоў таму на навагоднім свяце ў Мінску. У Гомелі ўпершыню і вельмі спадабалася, які чысты, прыгожы, дагледжаны горад. У маладзёжным міжнародным лагеры «Сяброўства» я ўжо ўдзельнічала летась, калі ён праходзіў на тэрыторыі Бранскай вобласці. Тут, у Гомельскай, вельмі хочацца паглядзець на менталітэт людзей, іх жыццё, таму што вы нашы суседзі і вельмі каштоўна сябраваць, падтрымліваць адносіны, — падзялілася студэнтка з Бранска.

Ва ўрачыстым адкрыцці фестывалю «Славянскае адзінства» бралі ўдзел вядучыя творчыя калектывы Гомельскай вобласці і запрошаныя расійскія артысты. Са святочнай сцэны да жыхароў Гомельшчыны і гасцей з рэгіёнаў Браншчыны з прывітальным словам звярнуўся старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Крупко.

— Нягледзячы ні на што, мы сёння разам, мы адзінныя, што пацвярджае і маштаб гэтага свята. Мы адзіныя ў эканоміцы, нягледзячы на сур'ёзны эканамічны ціск на дзве краіны, — падкрэсліў Іван Крупко. — Ідзе сур'ёзная работа ў будоўлі, каапэрацыі, па імпартазамяшчэнні, у гуманітарнай сферы.

Запамінальным момантам фестывальнай праграмы «Славянскае адзінства» стала вітанне гасцей свята калоны байкераў. Больш за 100 удзельнікаў мотапрабегу праехалі па цэнтральнай вуліцы Гомеля і прывіталі гараджан і гасцей узнятымі сцягамі Беларусі і Расіі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА,
фота аўтара.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім былога Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання КАРАВАЯ Уладзіміра Сяргеевіча ў сувязі з яго смерцю.

ПА МАРШРУЦЕ ПАМЯЦІ

Удзельнікі культурна-асветніцкай акцыі «Цягнік Памяці» працягваюць вандроўку па прасторах нашай краіны, на Віцебшчыне гасцей сустракаў старажытны Полацк.

Дзесці з Беларусі, Расіі, Арменіі і Кыргызстана, якія сталі ўдзельнікамі культурна-асветніцкай патрыятычнай акцыі «Цягнік Памяці», пазнаёміліся з самым старажытным горадам Беларусі. Яны пабывалі на цэнтральнай плошчы, прынялі віншаванні ад прадстаўнікоў адміністрацыі Полацка і Віцебскай вобласці. У праграме была сустрэча з маладзьмі і актыўнымі палачанамі каля помніка «Вызваліцелям Полацка» і Героям вайны 1812 года, таксама моладзь наведала Сафійскі сабор і Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт.

Асабліва ўразіў не толькі замежных, але і беларускіх падлеткаў канцэрт арганнай музыкі ў Сафійскім саборы. Марыя Белаконева з Чукоткі прызналася, што чула такое ўпершыню і адразу захапілася прыгожай і лёгкай музыкай, якая наводзіць на разважанні аб жыцці.

Расіянка Ульяна Канева ў Беларусі ўпершыню, дзяўчыну здзівіла прыгажосць маленькага найстарэйшага горада сінявокай. «Мы наведалі Сафійскі сабор, ён вельмі прыгожы, люблю стыль барока. Вельмі прыгожая арганная музыка, а я люблю класіку. У маім горадзе такога няма. Славутасцяў там вельмі шмат, але такіх старажытных збудаванняў няма», — падзялілася ўражаннямі Ульяна.

Школьнік з Калмыкіі Ад'ян Каманджаеў расказаў, што калі родныя даведаліся аб яго ўдзеле ў «Цягніку Памяці», то адсяткавалі такую выдатную падзею. Юнак у дарозе атрымліваў асалоду ад відаў лясоў, палёў. «У вас вельмі смачнае марожанае, я ніколі такога не еў. Калі б змог, узяў бы дадому, каб пачаставаць родных. Я ўжо знайшоў шмат знаёмых і, хоць сёння я заспаны, крыху стомлены, мне ўсё падабаецца. Гэта так выдатна — калі ёсць магчымасць пабываць там, дзе ніколі не быў. Дзякуй арганізатарам за такі падарунак, я нават не чакаў, што стану ўдзельнікам, сапраўды. Запомню гэтую паездку на ўсё жыццё», — расказаў хлопец.

Дарэчы, ён не адзіны замежны госць, каго ўразіла беларускае маёнтак, а яшчэ — светлыя невялікія будынкі ўздоўж утульных вулачак, чысціня, буяшчыя зеляніны і кветак, атмасфера спакою. Многія школьнікі паабяцалі вярнуцца на Полаччыну зноў, каб больш грунтоўна азнаёміцца са славутасцямі горада — калыскі беларускай дзяржаўнасці.

Прадстаўніца Віцебшчыны — 10-класніца Юлія Сомава — ад вандроўкі на колах часу ў захапленні, але больш чакае знаёмства з гарадамі Расіі. «Атмасфера ў цягніку сяброўская, замежных удзельнікаў здзіўляе чысціня нашых гарадоў і гасціннасць беларусаў. Вельмі радуе, што мы на працягу стольких стагоддзяў застаёмся шчырым і вятлівым народам», — падкрэсліла школьніца.

За 15 дзён 200 хлопчыкаў і дзяўчынак з розных краін пабываюць у беларускіх і расійскіх гарадах, змогуць пазнаёміцца з беларускімі і расійскімі традыцыямі, пабываць у месцах асаблівай сілы — на воінскіх мемарыялах і пахаваннях.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота БелТА.

Надвор'е

ПАД УЛАДАЙ АТМАСФЕРНЫХ ФРАНТОЎ

На тыдні чакаюцца дажджы, месцамі моцныя, і пахаладае

У большасці дзён чэрвеня ў нашай краіне назіраўся антыцыкланальны характар надвор'я, таму пераважала ў асноўным цёплае і сухое надвор'е, а дажджы насілі пераважна лакальны і кароткачасовы характар. Але на гэтым тыдні ініцыятыва ў надвор'і пяройдзе да атмасферных франтоў, якія зацягнуць воблачнасцю і не пакінуць да выхадных. Пры гэтым свой выхад яны будуць суправаджаць дажджамі рознай інтэнсіўнасці і працягласці, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Таму ўжо ў аўторак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. У дзённыя гадзіны месцамі будуць навальніцы, а ў асобных раёнах Брэсцкай і Гродзенскай абласцей пройдуць моцныя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах чакаецца туман. Максімальная тэмпература паветра днём 19—25 градусаў цяпла.

У сераду будзе «дзень рапсонаў». На большай частцы тэрыторыі Беларусі прагназуюцца дажджы, месцамі моцныя, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы ад 8 градусаў да 14 градусаў, а ўдзень — ад 14 да 20 цяпла. Месцамі чакаецца да плюс 23.

Ужо ў чацвер хваля адноснага холаду будзе ўжо сыходзіць. Але на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 9 да 14 цяпла. Удзень слупкі тэрмометра падымуцца да 18—25 градусаў.

У пятніцу ноччу месцамі па краіне, а днём на большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Уначы будзе 9—16 градусаў, а днём — ад 20 градусаў па паўночным усходзе да 28 па паўднёвым захадзе.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, у выхадныя стане яшчэ цяплей, і ў сярэдзіне дня тэмпература па краіне прагрэецца да 23—28 градусаў, але месцамі будзе плюс 19—22 градусы. У суботу франтальныя разделы пакінуць тэрыторыю Беларусі, і надвор'е палепшыцца, пры гэтым без дажджоў не абыдзецца.

У першы дзень ліпеня ўначы будзе пераважна без ападкаў, а ўдзень месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы дасягне 10—16 цяпла, а ўдзень — 23—28 градусаў. Месцамі чакаецца 20—22 градусы.

Сяргей КУРКАЧ.

СВЯТОЧНЫ МАРАФОН ДЛЯ ВІЦЕБСКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Скульптар пры стварэнні разглядаў самыя розныя варыянты ўвасаблення. Над макетам з ім працавалі шматлікія вядомыя краязнаўцы і архітэктары, якія крытычна ставіліся да шматлікіх пытанняў. У асноўным арыентаваліся на рэалістычны Віцебск пачатку XIX стагоддзя — гэта Фарны касцёл. Каб экскурсаводам было прасцей расказваць, што тут калісьці быў такі будынак, на макеце гэты касцёл прадстаўлены з купаламі. На памятным знаку адразу ўсталявалі QR-код, з дапамогай якога любы зацікаўлены можа паглядзець 45 хвілін відэазапісаў, праўнаўцы бронзавыя будынкі са старымі здымкамі. Цяпер не толькі звязаны з Віцебскім Шагал «можа палятаць над горадам» — мініяцюра памерам 140 на 180 сантыметраў дазваляе кожнаму жыхару і госцю культурнай сталіцы паглядзець на Віцебск з вышыні.



Вечарам у Летнім амфітэатры адбыўся святочны канцэрт «З днём нараджэння, Віцебск», у якім узялі ўдзел найлепшыя творчыя калектывы вобласці. Дарылі шчырыя музычныя падарункі з галоўнай сцэны Тэа і Вольга Рыжыкава, Глеб Лапіцкі, група «На-На».

З віншавальным словам да землякоў звярнуўся **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН**: «Цаной вялікіх чалавечых ахвяр і матэрыяльных страт наш горад выстаяў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Самаадданасць і працавітасць старэйшага пакалення дапамаглі адрадзіць яго з руін, удыхнулі новае жыццё. Прымянажаючы гістарычныя і культурныя традыцыі мінулых стагоддзяў, горад захоўвае самабытнасць і «Унікальнасць Віцебска — у яго старажытнай і сучаснай гісторыі, геаграфічных лёсах людзей, якія ўзводзілі і абаранялі яго, у велічы белакаменных храмаў і сучаснай інфраструктуры. Наш горад — гэта гісторыя вялікіх перамог і гераізму беларускага народа. Сёння мы звязваем свята каларыт. Непаўторную аўру горада і яго неацэнны капітал ствараюць людзі. Адкрытыя, шчодрыя душой і сэрцам, працавітыя і адказныя віцябчане ўмеюць думаць па-наватарску, спалучаць досвед і майстэрства з імкненнем стала ўдасканальвацца. Віцебская прадукцыя шырока вядома не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Сёння 73 краіны ажыццяўляюць знешнегандлёвую дзейнасць з арганізацыямі горада. Высокую рэпутацыю маюць нашы вышэйшыя навучальныя ўстановы, сусветную славу прынеслі нам дасягненні мастацкай і спартыўнай школ. Візітка сучаснага Віцебска — гэта, вядома, міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар». Кіраўнік рэгіёна дадаў, што ў Віцебска вялікі патэнцыял і шырокія перспектывы. Гэта не дае ўсумніцца ў тым, што горад прадоўжыць уносіць дастойны ўклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё вобласці і садзейнічаць далейшаму ўмацаванню і працвітанню краіны».

За шматгадовую працу на карысць горада і высокі прафесіяналізм Аляксандр Субоцін ад імя аблвыканкама ўручыў падзякі віцябчанам — найлепшым прадстаўнікам сваёй галіны, сярод якіх — асфальтабетоншчыкі, работнікі чыгункі і зелянбуда, спецыялісты ТЦСАН і іншыя.

Другі дзень быў прысвечаны 125-годдзю віцебскага трамвая. Сем трамвайных вагонаў выйшлі на святочны маршрут і праехалі маршам па цэнтральным праспекце горада да плошчы Перамогі. Узначальваў калону вагон з духавым аркестрам, дзе гараджан віталі людзі ў касцюмах мінулых стагоддзяў. Наступным ішоў экскурсійны вагон або трамвай-музей, у якім з дапамогай фотаматэрыялаў прапанаўвалі азнаёміцца з гісторыяй віцебскага рэйкавага транспарту. Вагон, дарэчы, не выходзіў на маршрут ужо чвэрць стагоддзя, а сёлета быў адноўлены спецыяльна да юбілею. Ён будзе курсіраваць па Віцебску і ў звычайныя дні.

Парк 1000-годдзя таксама абнавіўся да дня нараджэння горада: у ім з'явіліся дзіцячыя, спартыўныя і інклюзіўныя зоны. Жыхары найбліжэйшых раёнаў даўно чакалі, калі месца адпачынку набудзе новы выгляд, і нарэшце ў святочнай атмасферы адбылося адкрыццё шматфункцыянальнай зоны. Каля вадаёма з'явіўся пункт пракату катамаранаў для павольных прагулак, а новы плавальны фантан будзе стварацъ асаблівую атмасферу ўвечары дзякуючы яркаму падсвятленню. Для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі тут усталяваліі інтэрактыўныя арэлі, для аматараў спорту стварылі пляцоўкі для міні-футбола, стрытбола і варкаўта.

Некалькі дзён запар радаваў самых маленькіх жыхароў горада і іх бацькоў на пляцоўцы каля Музея гісторыі прыватнага калекцыянiравання даўні сябар горада на Дзвіне — заслужаны артыст Расіі Мікалай Чалнакоў свайм цыркавым спектаклем. Вярнулася і незвычайная традыцыя віцебскіх музыкаў віншаваць горад з балкона Ратушы ў рамках праекта «Скрыпка над горадам». Шматлюдна было і на плошчы 1000-годдзя Віцебска: тут прайшло парашутнае свята 4-га адкрытага чэмпіянату Беларусі па парашутным спорце ветэранаў-парашутыстаў, ветэранаў баявых дзеянняў. У комплексе культурна-масавага адпачынку імя Савецкай Арміі разгарнуўся фестываль гістарычнай рэканструкцыі «Плоская гара».

25 чэрвеня горад жыў у маладзёжных рытмах, адзначаючы на шматлікіх пляцоўках Дзень моладзі. Зарад бадзёрасці ўсе ахвотныя атрымалі з самай раніцы на плошчы Перамогі ў межах народнай фітнес-разминкі. Тут жа праходзіла выстаўка аўтамабіляў расійскага «Мустанг Клуба». Звыш 120 удзельнікаў з розных куткоў Беларусі сабрала традыцыйны велапрабег «ВелаВіцебск». Цэнтральнай падзеяй дня стаў абласны тур і гала-канцэрт нацыянальнага фестывалю маладзёжнай творчасці «Агонь маладзёжных талентаў», у якім узялі ўдзел каля 300 чалавек з Віцебскай вобласці. Завяршыўся дзень дыджэй-батлам на плошчы Перамогі.

Фінальным акордам святочнага марафону 26 чэрвеня, у Дзень вызвалення Віцебска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, стала ўскладненне вянкоў і кветак да мемарыяльнага комплексу ў гонар савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў Віцебшчыны.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота аўтара і БелТА.

ТУТ БЫЎ І ПАЛАЦ, І БРОВАР...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А між тым, комплекс сапраўды ўнікальны. Як расказаў **загадчык аддзела навейшай гісторыі Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея Андрэй ВАШКЕВІЧ**, былы піўзавод увасобіць у дзясятку самых старых будынкаў горада, да таго ж аб'яднаўшае два розныя па сваім прызначэнні аб'екты — некалі велічны палац і прамысловы бровар.

У аснове комплексу знаходзіцца былы палац Сапегаў і Агінскіх, будаўніцтва якога адносіцца да 80-х гадоў XVII стагоддзя. Такім чынам цэнтральную аб'єкту больш за 340 гадоў. Ёсць меркаванне, што гэта быў велічны па сваёй архітэктуры палац у стылі барока. Праўда, дасканала першапачатковы выгляд не ўдалося ўстанавіць, бо ніякіх інвентарных дакументаў ці апісанняў не захавалася. А першы малюнак дайшоў з XVIII стагоддзя, калі палац значна змяніўся.

— Гісторыя дадзенага аб'екта звязаная з падзеямі канца XVII стагоддзя, калі ў Гродне пачалі праходзіць каралеўскія сеймы, а магнаты — будаваць свае палацы. Іх было даволі шмат. Захавалася некаторыя часткі тых будынкаў у даволі перабудаваным выглядзе. Нямала такіх палацаў знаходзілася на так званым Падоле, забудове на берагах Нёмана, у тым ліку і палац Агінскіх, які таксама перабудоўваўся, — паведаміў Андрэй Вашкевіч.

А перабудаваў гэты комплекс у 70-х гадах XIX стагоддзя аўстрыйскі прамыслоўец, прафесійны бровар Юзаф Кунц. Ён разгарнуў тут даволі буйную вытворчасць піва. На тэрыторыі комплексу была ўстаноўлена паравая машына, абсталяваны памяшканні, з'явілася артэзіянская свідравіна з якасной вадой. Запуск завода адбыўся ў 1877 годзе. Дарэчы, гэтую дату і сёння відаць на галоўным будынку. У савецкі час тут таксама была вытворчасць піва, але з-за нізкай рэнтабельнасці завод закрылі.

— Гродзенскі піўзавод аб'яўлены аб'ектам прамысловай спадчыны і ахоўваецца дзяржавай. У Гродне такіх будынкаў некалькі. Гэта былая кафлярня, а таксама тытунёвая і пальчаткавая фабрыкі, якія дзейнічаюць і сёння, — удакладніце навуковец.

ЯК ІДЗЕ РЭКАНСТРУКЦЫЯ?

У 2020 годзе былы піўзавод нарэшце быў прададзены суменсвай кампаніі за 1,3 мільёна рублёў. Больш за год ішлі даследчая работа і ўзгадненне праекта. І леташняй восенню нарэшце распачалі рэканструкцыю.

Дырэктар будаўнічай арганізацыі Валерый ХУТКО ўспамінае, што яго вельмі ўразіў размах работ на аб'екце, а таксама занятае старажытнага комплексу. Між тым абследаванне будынкаў давала надзею на іх аднаўленне. Быў зроблены аналіз сцен. Аказалася, яны даволі трывалыя, таўшчыня іх дасягае паўтара метра. Такія сцены, па словах будаўніка, мала дзе можна ўбачыць, хоць у арганізацыі ёсць вопыт работы на гістарычных аб'ектах.

Цяпер тут актыўна ідуць работы. На месцы аварыйнай пабудовы ўзводзіцца аналагічны будынак, пад якім захаваўся старажытны падвал, ён таксама будзе задзейнічаны пасля рэканструкцыі. Своеасаблівы кампраміс паміж старым і новым.

Дырэктар будаўнічай кампаніі лічыць, што 20 працэнтаў работ ужо праведзена. Завяршаецца дэмантаж тых канструкцый, якія не маюць гістарычнай каштоўнасці. Прывозіцца ў парадак фасады. Найбольш працаёмкай лічыцца рэканструкцыя старажытнага палаца. Будынак часта мяняў прызначэнне. Выкарыстоўваўся як склад і нават як жылыя памяшканні. Работы тут вядуцца з выкарыстаннем аўтэнтычных матэрыялаў.

— Усюды была сучасная тынкоўка, яе збілі, расчысцілі фасады, яна будзе класіцізна нанава, але знадворны фасад былога палаца застанецца ў старым цагляным выглядзе з гістарычнымі аркамі, — каментуе Валерый Хутко. — Хутка пачнём мантаж, будзем рабіць перакрыцці, таксама ў гістарычным выглядзе, з бэлькамі, столямі, каб максімальна паўтарыць атмасферу, якая была ў той час. Унутры таксама застануцца фрагменты старажытнай кладкі.



Цагліны старыя, ручной фармоўкі, на некаторых відаць адбіткі пальцаў работнікаў. І кожную цагліну мы чысцім і запускаем у работу. Імкнёмся максімальна захаваць гістарычнае аблічча, таму пры аднаўленні кожная цаглінка кладзецца адпаведна з патрабаваннямі Міністэрства культуры, якое курыруе рэканструкцыю аб'екта.

У ходзе работ быў знойдзены падвал, які не значыўся ў праекце. Гэтае старажытнае памяшканне было замураванае ў савецкі час. Праўда, нічога каштоўнага ў гістарычным сэнсе там не знайшлі, тым не менш само памяшканне будзе задзейнічана ў будучым комплексе.

Усе падвалы будуць прыстасаваны пад новыя патрэбы. Іх агульная плошча складае прыкладна 800 «квадратаў». Некаторыя засталіся яшчэ з XVII стагоддзя і маюць столь вышынёй 5-6 метраў.

Звяртаюць на сябе ўвагу высокія цагляныя трубы. Па словах кіраўніка будаўнічай арганізацыі, яны прывезены ў парадак, ачышчаны, а вось металічны флюгер на адной з іх будзе мяняцца. Ён будзе зроблены па аналогіі з тым, што быў устаноўлены ў часы бровара Кунца.

На аб'екце працуюць тры будаўнічыя арганізацыі, якія павінны выканаць усе работы — ад пакатчу і да канца. Магчыма, будоўля ішла б хутчэй, калі б не дэфіцыт кваліфікаваных рабочых. Ва ўсякім выпадку, мяркуецца, што комплекс пачне дзейнічаць налета.

ЧЫМ ЗДЗІВІЦЬ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ?

Як сведчыць шыльда, рэканструкцыя будынкаў па вуліцы Заводскай, 2, былога броварнага завода вядзецца пад шматфункцыянальны комплекс.

Контуры будучага аб'екта вызначаны, усе тры будынкі задзейнічаны ў рэканструкцыі.

Па словах **намесніка дырэктара кампаніі ТАА «МБА Інвестмент» Аляксандра ЗАГЛУБОЦКАГА**, гэта будзе вялікі гастранамічны корт. Мяркуецца размясціць тут 12-15 аб'ектаў харчавання рознага кірунку. Для дзяцей прадугледжана гульнявая пляцоўка. Асаблівая ўвага будзе аддавацца культурнай прасторы. У памяшканнях і падвалах можна будзе пазнаёміцца з рознымі музейнымі экспазіцыямі, у тым ліку з гісторыяй Гродна і развіццём броварства ў рэгіёне. Акцэнт робіцца на аўтэнтычныя экспанаты, знойдзеныя пры будаўнічых работах альбо якія захаваліся ў прыватных калекцыях.

Усе тры карпусы будуць злучаны паміж сабой пераходамі і галерэямі. Па словах інвестараў, задача — даволі складаная, бо на працягу стагоддзяў тут пастаянна штосьці перабудоўвалі. І цяпер важна максімальна захаваць гістарычную частку і дабудаваць аварыйныя будынкі такім чынам, каб можна было іх рацыянальна выкарыстоўваць. Прадугледжана і вялікая паркоўка.

Мяркуецца, што комплекс пачне прымаць наведвальнікаў у наступным турыстычным сезоне. Тэрыторыя яго даволі значная — каля шасці тысяч квадратных метраў. Будзе абсталяваны спуск да Нёмана, з'явіцца праходы да палацаў на Замкавай гары. Такім чынам, новы аб'ект будзе ўключаны ў адзіную гістарычную гарадскую прастору. Пазней пачнецца будаўніцтва гасцініцы.

— Тое, што цяпер адбываецца з аб'ектам, — гэта спроба спалучыць у сучасным прачытанні яго палацавы змест XVII стагоддзя і броварны завод з яго прамысловай архітэктурай, — адзначыў навуковец Андрэй Вашкевіч.

Дарэчы, непадалёку ад карпусоў старажытнага завода мяркуецца адкрыць яшчэ некалькі гістарычных аб'ектаў, праўда, поўнасцю страчаных. Дзеля гэтага два ўчасткі выкуплены інвестарамі каля харальнай сінагогі. Днямі прададзены былы Дом афіцэраў, аб'ект у стылі канструктывізму ў цэнтры горада. Вядуцца работы па аднаўленні будынка першай у Беларусі медыцынскай акадэміі.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

ТЕХНОБАНК

ОАО «Технобанк»
220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кропоткина, 44,
Телефон +375 17 283 15 10

ОАО «Технобанк»
Финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2022 года

(в тысячах белорусских рублей)

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ

	Приме-чания	31 декабря 2022 года	31 декабря 2021 года
АКТИВЫ			
Денежные средства и их эквиваленты	5	513 009	249 646
Драгоценные металлы	6	778	856
Средства в финансовых организациях, Национальном банке	7	13 052	19 211
Кредиты клиентам	9	345 468	389 334
Финансовые активы, оцениваемые по справедливой стоимости через прочий совокупный доход	10	11 214	54 467
Финансовые активы, учитываемые по амортизированной стоимости	11	41 072	-
Производные финансовые активы	12	-	156
Кредиты, предоставленные банкам под залог ценных бумаг	8	37 620	44 989
Инвестиционная недвижимость	13	1 423	1 994
Основные средства, нематериальные активы, активы в форме права пользования	14	30 605	29 869
Внеоборотные активы, предназначенные для продажи	15	2 116	2 670
Прочие активы	16	6 188	2 581
ИТОГО АКТИВЫ		**1 002 545**	**795 773**
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Обязательства			
Средства финансовых организаций	17	6 693	5 766
Средства клиентов	18	747 450	600 758
Выпущенные долговые ценные бумаги	19	14 612	27 873
Производные финансовые обязательства	12	19	-
Привилегированные акции	20	19	19
Обязательства по отложенному налогу на прибыль	32	9 158	13 385
Прочие обязательства	21	17 182	13 043
ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА		**795 133**	**660 844**
СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	22	52 787	52 787
Фонд переоценки основных средств	22.2	1 386	2 075
Не забываецца педагагічны калектыў і пра інтэлектуальнае і творчае ўдасканаленне сваіх падапечных. На развіццё дробнай маторыкі, фантазіі і прасторавага мыслення працуюць лепка з цеста і пластыліну, арыгамі, флярыстыка, кропкавы жывапіс і, вядома, лега-цэнтр, дзе, дарэчы, стажыравацца студэнт з КНР, пераймаючы вопыт сучаснай беларускай дашкольнай адукацыі.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

УНП 400036117

Бывайце здаровы!

ВАДА ДОРЫЦЬ БАДЗЁРАСЦЬ

Начальнік аддзела спорту і турызму Галіна КАСЦЯШКІНА і намеснік старшыні Мазырскага райвыканкама Фелікс ГАЛЮК абмяркоўваюць рабочыя пытанні.

Басейн спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 2 Мазырскага раёна адкрыўся пасля капітальнага рамонту з мадэрнізацыяй і рэканструкцыяй у 2019 годзе. Цяпер гэты сацыяльна важны аб'ект — адзін з цэнтраў прыцягнення не толькі для жыхароў мікрараёна, але і для ўсяго горада.

Падчас рэканструкцыі былі выкананы работы на 25-метровай і малой чашах, фасадзе і даху, заменены інжынерныя сеткі, абсталяваны раздзявалкі і душавыя, добраўпарадкавана прылеглая тэрыторыя. З'явіліся таксама дзве залы — трэнажорная, абсталяваная па апошнім слове тэхнікі, і зала гімнастыкі і паветранай акрабатыкі. Працуе і трэнажорная пляцоўка пад адкрытым небам з сістэмай турнікоў — там трэнеры і спартыўныя інструктары праводзяць спаборніцтвы па сілавым экстрыме, прыняць удзел у якіх можа любы, хто пажадае.

— Гэты раён Мазыра вельмі густа населены, і такога спартыўнага цэнтра тут вельмі не хапала, — адзначае **начальнік аддзела спорту і турызму Мазырскага райвыканкама Галіна КАСЦЯШКІНА.** — Басейн карыстаецца вялікай папулярнасцю ў дзяцей і дарослых самых розных узростаў.

Кошт наведвання басейна (45 хвілін) — усяго 6 рублёў. Для дзяцей і пенсіянераў прадугледжаны скідкі. Працуе басейн з 7 гадзін раніцы — каб тыя, хто хоча, паспелі паплаваць перад пачаткам працоўнага дня, бо сучаснаму чалавеку не проста выкраіць час на аздараўленне днём ці ўвечары.

— Тут устаноўлена сістэма ачысткі вады, — распавядае Галіна Аляксандраўна. — Камп'ютар задае тэмпературу вады і падтрымлівае яе.

Для людзей з абмежаванымі магчымасцямі прадугледжаны механізм бяспечнага апускання ў ваду, а для ўздыму на другі паверх, у трэнажорную залу, — спецыяльны пад'ёмнік.

— У выбары і ўстаноўцы гэтага абсталявання прымалі ўдзел прадстаўнікі грамадскага аб'яднання інвалідаў-каляскачнікаў нашага раёна, — падкрэсліла спецыяліст.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Навучэнцы СДЮШАР № 2 Мазырскага раёна падчас заняткаў у басейне.

Трэніроўка ў фізкультурна-аздараўленчым цэнтры «Палессе-Арэна».

Белае золата

Якасныя малочныя прадукты былі і застаюцца залогам моцнага здароўя нацыі, лічаць у Мазыры

Карысныя і смачныя натуральныя прадукты — тое, чым славіцца Беларусь. Сапраўдным брэндам сярод іх даўно стала малочная прадукцыя. Запаведныя лугі і поймы рэк Мазырскага Палесся дораць сыравіну, з якой спецыялісты Камунальнага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Мазырскія малочныя прадукты» ствараюць творог і масла, ёгурты і дэсерты, смятану, кефір, ражанку... І гэта далёка не ўвесь асартымент, які выпускае адно з найстарэйшых малочных прадпрыемстваў нашай краіны.

Дырэктар КВУП «Мазырскія малочныя прадукты» Алена КАСУХА.

Намеснік дырэктара па ідэалагічнай і кадравай рабоце і быце Ганна ЗДАНЕВІЧ разам з начальнікам вытворчасці Таццянай РУСІНАЙ абмяркоўваюць асаблівасці ўпакоўкі прадукцыі ў аддзяленні вытворчасці тварагу «DANIDA».

У Беларусі на рынку малочных прадуктаў канкурыраваць няпроста: малочнікі жартуюць, што на літр малака, які хоча выпіць беларускі спажывец, у нашай краіне выпускаецца тры літры. Прапанова на ўнутраным рынку сапраўды найшырэйшая, і, каб пакупнік ацаніў, запомніў і пачаў пазнаваць менавіта ваш прадукт, на вышыні павінны быць і смак, і якасць. Найважнейшая канкурэнтная перавага брэндаў «Радуга вкуса» і «Крепость здоровья», пад якімі выпускаецца «малочка» ў Мазыры, — натуральнасць і экалагічнасць: менавіта гэтыя характарыстыкі сёння неверагодна высока цэняцца і спецыялістамі правільнага харчавання, і адэптамі здаровага ладу жыцця. Шырокі асартымент прадуктаў ад мазырскіх «малочнікаў» аб'ядноўвае тое, што яны не ўтрымліваюць ніякіх сінтэтычных дабавак — толькі натуральныя кампаненты.

— Наша прадукцыя вырабляецца з натуральнай, высакаякаснай і бяспечнай сыравіны, — адзначае **дырэктар ДП «Мазырскія малочныя прадукты» Алена КАСУХА.** — А калі пры вытворчасці ёгуртаў і дэсертаў мы выкарыстоўваем напаўняльнікі, то і яны — толькі з натуральнай сыравіны, без дабавак і «хімію».

У сучасным свеце захаваць сапраўды натуральны смак і склад прадукту па сілах далёка не кожнаму вытворцу. Як гэта ўдаецца калектыву «Мазырскіх малочных прадуктаў»?

КУДЫ ЦЯКУЦЬ МАЛОЧНЫЯ РЭКІ

Сыравінная зона прадпрыемства — Мазырскі, Нараўлянскі і Ельскі раёны, самае сэрца Палесся, запаведны край. Менавіта адсюль, з малочна-таварных комплексаў і з найлепшых гаспадарак рэгіёна, штодня магутныя малакавозы прывозяць на ДП «Мазырскія малочныя прадукты» адборнае, свежае малако гатунку «экстра» і вышэйшага: кожны дзень прадпрыемства перапрацоўвае каля 300 тон каровінага малака. Супрацоўнікі лабараторыі адбіраюць пробы малака з кожнай машыны, што прыйшла на малаказавод. Пробы паступаюць у лабараторыю прадпрыемства. Прадмет усебаковых даследаванняў — чысціня ад прымешкаў, шчыльнасць, кіслотнасць, наяўнасць антыбіётыкаў, а таксама мікрабіялагічныя і радыялагічныя паказчыкі.

— Што датычыцца радыялагічнага кантролю, аднэчу, што ні разу за апошнія два дзесяцігоддзі ў малацэ, якое прыбывае на прадпрыемства, не было выяўлена радыенуклідаў. А акрамя таго, што мы самі штодня старанна правяраем сыравіну, таксама рэгулярна, згодна з графікам, пробы адпраўляюцца на абласны кантроль, — кажа кіраўнік прадпрыемства.

Словам, у цэхі паступае толькі на сто працэнтаў бяспечная, высакаякасная сыравіна. З яе вырабляецца больш за 70 відаў малочных прадуктаў, якія спажывец ведае пад брэндамі «Радуга вкуса» і «Крепость здоровья». Першы брэнд для прадпрыемства асноўны — ён аб'ядноўвае больш за 50 найменняў: ёгурты і пудынгі, малако і кефір, біяражанка і сметанковае масла, асвяжальныя напоі на аснове малочнай сыроваткі і дэсерты.

Мазыране любяць гэтую прадукцыю, а вытворцы (калектыў прадпрыемства «Мазырскія малочныя прадукты» — каля 430 чалавек) шануюць сваіх спажыўцоў і арыентуюцца на іх запыты і густы. Тут ведаюць, якія ёгурты або дэсерты ў пакупніка самыя любімыя, што з навінак больш за ўсё прыйшлося да душы спажыўцу і чаму. Нягледзячы на ўражальныя аб'ёмы (напрыклад, штодня з канвеера прадпрыемства сыходзіць больш за 6 тон тварагу, а на ўчастку сухога малака за суткі перапрацоўваецца каля 130 тон малака) і шырокую геаграфію паставак (мазырская «малочка» адпраўляецца ў многія краіны свету, уключаючы далёкі Кітай, хоць галоўныя яе спажыўцы — Мазырскі рэгіён і Гомельшчына), вытворца здолеў захаваць душэўную цеплыню і «адраснасць» сваіх прадуктаў. Тут гатуюць іх так, нібы робяць для сваёй сям'і. І гэта правільны падыход, бо малочныя прадукты — не толькі залог здароўя і даўгалецця. Гэта яшчэ і сімвал непаўторных беларускіх традыцый, любові і згоды ў сям'і, дамашняй утульнасці.

— Інакш і быць не можа, — падкрэслівае Алена Аляксееўна. — Наша прадпрыемства ўнікальнае тым, што кожны яго супрацоўнік укладвае душу ў тое, што робіць. Бо гаворка ідзе аб прадуктах харчавання, і ад таго, якімі яны будуць, залежыць і наша рэпутацыя, і давер пакупнікоў, і імідж прадпрыемства.

Другі брэнд ад «Мазырскіх малочных прадуктаў» добра вядомы ўсім, хто клапоціцца аб правільным харчаванні. Таварны знак «Крепость здоровья» аб'ядноўвае карысныя кісламалочныя і малочныя прадукты з нізкім утрыманнем тлушчу, якія падтрымліваюць імунітэт, нармалізуюць абмен рэчываў і аздараўляюць мікрафлору кішэчніка. З яго дапамогай Мазырская прадпрыемства ўвасабляе ў жыццё лозунг «Здароўе людзей — наш клопат!».

— Напрыклад, пад брэндам «Крепость здоровья» мы выпускаем лячэбна-прафілактычны прадукт «Біфітат», які высока ацанілі і мамы малых, і спартсмены, і людзі, якія выздараўліваюць пасля цяжкіх захворванняў, — распавядае дырэктар.

Прадпрыемства імкнецца адпавядаць самым высокім стандартам сусветных вытворцаў малочнай прадукцыі, а значыць, ключавымі ў вытворчасці павінны стаць сучасныя тэхналагічныя лініі. Завод пастаянна ўкладвае сродкі ў мадэрнізацыю і тэхнічнае пераўзбраенне.

— У нашых цэхах усе тэхналагічныя працэсы максімальна аўтаматызаваныя: то-бок, уплыў «чалавечага фактару» на якасць прадукцыі практычна выключаны, — падкрэслівае **галоўны інжынер ДП «Мазырскія малочныя прадукты» Аляксандр ПАТАПАЎ.** — Усё абсталяванне — ад еўрапейскіх вытворцаў, а самая «старэйшая» наша тэхналагічная лінія датуецца 2011 годам. Укараненыя міжнародныя стандарты і гігіенічныя нормы: у прыватнасці, сістэма менеджменту бяспекі СМБПП у адпаведнасці з патрабаваннямі стандарту ISO 22000:2018, а таксама сістэма «Халяль». Такім чынам, узровень вытворчай культуры дазваляе гарантаваць найвышэйшую якасць нашай прадукцыі.

Адпаведнасць стандарту «Халяль» дазваляе «малочным рэкам» з Мазыра «цячы» на многія тысячы кіламетраў — прадпрыемства мае магчымасць пашырыць геаграфію паставак у краіны ісламскага свету. А працяглыя тэрміны свежасці прадукцыі дасягаюцца дзякуючы высокай якасці выходнай сыравіны, закрытаму вытворчаму цыклу, максімальнай аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў, забеспячэнню асептыкі пры фасоўцы і выкарыстанню сучаснай экалагічнай упакоўкі. Мазырская «малочка» мае шырокую геаграфію паставак на экспарт — краіны блізкага і далёкага замежжа, у тым ліку далёкія рэгіёны Расіі, КНР, Грузія, Казахстан, Арменія, Егіпет.

Прадукцыя пад брэндамі «Радуга вкуса» і «Крепость здоровья» не раз была высока ацэнена на айчынных і міжнародных спецыялізаваных выстаўках. У тым ліку такіх знакамітых, як «Прадукт года», «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», «Чэмпіён смаку», «Найлепшы смак». У актыве прадпрыемства таксама мноства міжнародных узнагарод.

Майстар вытворчасці сухіх малочных прадуктаў Максім КРУК і інжынер-тэхнолаг Дзіяна КАМАРОВІЧ у цэху па вытворчасці сухога малака.

Мазыр вызвалілі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у студзені 1944 года, і неўзабаве з'явіўся загад аб адраджэнні харчовай прамысловасці. І ўжо ў жніўні ў цэхах завода з канвеера сышлі першыя малочныя прадукты.

— Але, паводле некаторых гістарычных звестак, малочная вытворчасць тут існавала задоўга да сярэдзіны мінулага стагоддзя, — адзначае Аляксандр Мікалаевіч. — Вядома, што яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны ў навакольных вёсках былі сепаратарныя зоны, а ў Мазыры функцыянавалі малочны завод.

Сёння адзін з найстарэйшых у краіне вытворцаў якасных малочных прадуктаў чуйна рэагуе на патрэбы рынку, пашыраючы лінейку тавараў.

Напрыклад, у 1975 годзе ў сувязі з будаўніцтвам Калінкавіцкага малаказавода ў Мазыры быў спынены выпуск сметанковага масла. Але да пачатку 2000 года ўчастак адрадзілі — і сёння мазырскаму маслу з далікатным сметанковым смакам аддаюць перавагу мясцовыя пакупнікі, а таксама ацанілі і палюбілі ў іншых рэгіёнах краіны.

Інвестыцыйная праграма, распрацаваная да 2025 года, прадугледжвае развіццё ўчастка натуральнамалочнай прадукцыі. Закуплена і ўстаноўлена італьянская лінія коштам 970 тысяч еўра для выпуску малака, кефіру і ёгуртаў у пэт-бутэльках. Абсталяванне ўжо змантіравана, вядуцца пусканаладачныя работы. Лінія дасць таксама магчымасць разліваць малочныя прадукты ў шкляныя бутэлькі — то-бок, у экалагічна чыстую тару, што таксама з'яўляецца адным з сучасных трэндаў.

— Ёсць у нас і яшчэ адзін важны праект. Ён датычыцца выпуску хуткарастваральнага сухога малака, — расказвае Аляксандр Патапаў. — У 2015 годзе мы ўвялі ў эксплуатацыю ўчастак па выпуску сухіх малочных прадуктаў — гэта сухое абястлушчанае малако і сухое неразведзенае малако. Гэтыя прадукты прызнаваны для вельмі далёкай дугі — за кошт тэхналогіі дасягаецца тэрмін іх захоўвання 24 месяцы.

Цяпер гэты прадукт абсталяванне дазваляе фасаваць толькі ў буйную тару — па 25 кг. Але сухое малако мае неверагодна высокі экспартны патэнцыял, а буйная фасоўка дае магчымасць рэалізаваць толькі частку гэтага патэнцыялу.

— Сёлета мы правялі два тэндары, — адзначае дырэктар прадпрыемства. — Адзін — на мадэрнізацыю існуючага абсталявання па вытворчасці сухога малака і другі — на набыццё аўтамата для ўпакоўкі гэтага прадукту ў спажывецкую тару. Пасля рэалізацыі гэтых праектаў атрымаем магчымасць выпускаць сухое малако ў дробнаштучай фасоўцы — па 100, 300, 500 і 1000 г. Такое рашэнне вельмі запатрабаванае ў свеце, асабліва на кітайскім напрамку. Тым больш што мадэрнізацыя дазволіць дасягнуць тэрміну прыдатнасці прадукту ў 24 месяцы. А значыць, яго можна будзе прывезці ў абсалютна любы пункт свету.

Ну, а для землякоў «Мазырскія малочныя прадукты» працягваюць пашырацъ сетку фірменнага гандлю — крамы і сучасныя павільёны па ўсім Мазыры, а таксама ў Гомелі і Ельску. І кожнай раніцай на ўласным транспарце (у аўтапарку прадпрыемства — больш за 50 машын) адпраўляюць на прылаўкі найсвяжэйшыя малочныя прысмакі, якія дораць людзям здароўе і сілы.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,
Алена ДАЎЖАНОК,
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Участак па разліве малочнай прадукцыі ў ПЭТ і шкляную бутэльку.

Аператар расфасовачна-ўпаковачнага аўтамата Алена НАХАРАНКА пакуе гатовую прадукцыю ва ўчастку вырабу дэсертаў.

УНП 490419919

ОАО «БЕЛАРУСКАБЕЛЬ»
www.belaruskabel.by

ЗЛУЧАЮЧЫ СУСВЕТЫ

У сучасным свеце гарады і краіны, галіны эканомікі і вытворчасці злучаюць электрычнасць і інтэрнэт. Ні першае, ні другое не магчыма без кабельных вырабаў. І сёння ў Беларусі не існуе ніводнай сферы — больш за тое, практычна ніводнага праекта, звязанага з сістэмамі аўтаматызацыі — дзе б не прымянялася прадукцыя ААТ «Беларускабель».

ААТ «БЕЛАРУСКАБЕЛЬ» выпускае за год больш як 150 тысяч кіламетраў кабельна-правадніковай прадукцыі: яе агульнай даўжыні хопіць, каб тры разы аперазаць зямны шар

Мазырскі гігант кабельнай прамысловасці яшчэ ў савецкія гады грымеў на ўвесь Саюз як адзін з найлепшых вытворцаў кабельна-правадніковай прадукцыі. Сёлета прадпрыемству споўняецца 64 гады, наступны год для калектыву ААТ «Беларускабель» — юбілейны. Салідны ўзрост працуе толькі ў плюс, памнажаючы традыцыі якасці. Сёння ў цэхах «Беларускабеля» выпускаюць каля 150 відаў вырабаў, сфера прымянення якіх — ад будаўніцтва да мікраэлектронікі, ад авіятэхнікі да касмічнай галіны, ад арктычных ільдоў да пустынь і тропікаў. Прадпрыемства заўсёды было экспартаарыентаваным — больш за палову яго прадукцыі адпраўляецца на экспарт у дзясяткі краін свету. Сёння магутнасці прадпрыемства загружаны мінімум на тры месяцы наперад, а стратэгія развіцця разлічана да 2030 года. Перспектыўны план уключае як мадэрнізацыю ўжо устаноўленых ліній, так і набыццё новага абсталявання.

Дырэктар Віталь ШЫЛАЎ дэманструе геаграфію распаўсюджвання прадукцыі прадпрыемства.

У НАГУ З ЧАСАМ

— На 2023-2024 гады на інвестыцыі ў абнаўленне вытворчасці закладзена 5,5 млн BYN, але мы гэты аб'ём перавыконваем. Сучаснае абсталяванне дае магчымасць упэўнена адчуваць сябе не толькі на беларускім, але і на сусветным рынку, — падкрэслівае **дырэктар ААТ «Беларускабель» Віталь ШЫЛАЎ.**

За год на інвестыцыйныя праекты па мадэрнізацыі і тэхнічным пераўзбраенні прадпрыемства траціць да мільёна долараў, адзначае **намеснік дырэктара па развіцці Дзмітрый ФІРАНЧУК.** І гэтыя сродкі акупляюцца мнагакратна.

— У 2020 годзе правялі дыверсіфікацыю рынкаў збыту, пераарыентаваліся ў большай ступені на расійскі рынак, але пры гэтым не забыліся і на іншыя краіны, — адзначае Дзмітрый Мікалаевіч. — Цяпер заходзім у Афрыканскі рэгіён, на рынак усходніх краін-суседзяў (Туркменістан, Казахстан, Узбекістан, Азербайджан і г. д.). Там свая спецыфіка, і быццам бы нішы занятыя, але ў нашай арганізацыі шырокі асартымент прадукцыі — нямногія кабельныя заводы могуць пахваліцца такой наменклатурай, і тая дае нам канкурэнтную перавагу. Вырабаў мы выпускаем больш за 150, але толькі разлічаных тэхналагічных канструкцый у нас — больш за 140 тысяч. А калі ўлічыць, што ў адным ТУ існуюць розныя маркі памераў, атрымліваюцца мільёны і мільёны канструкцый. Ёсць вырабы, якія не паўтараюцца ніколі, — іх распрацоўваюць і ствараюць пад пэўную задачу заказчыка.

Прадпрыемства заўсёды рабіла ўпор на вытворчасць кабеляў спецыяльнага прызначэння, якія патрэбны для вырашэння канкрэтных задач. Напрыклад, калі ў свой час Мазырскі НПЗ правадзіў мадэрнізацыю і ўстанаўліваў у сваіх цэхах нямецкае абсталяванне, яму спатрэбілася спецыялізаваная кабельная прадукцыя — і такую прадукцыю забяспечыў «Беларускабель». Светлагорскі ЦКК будавалі кітайскія партнёры, і зноў па кабельна-правадніковай прадукцыі спатрэбілася імпартазамяшчэнне.

— Акрамя таго, мы працуем на авіяцыйную прамысловасць і ВПК нашай краіны і суседняй Расіі, — дадае Дзмітрый Фіранчук. — У цяперашні час ёсць узмоцнены попыт па авіягрупе. На ўсёй постсавецкай прасторы прадпрыемствaў, якія могуць вырабляць кабельную прадукцыю для авіяцыі, літаральна некалькі.

У 2016—2018 гадах да 40-50 % магутнасцяў прадпрыемства было загружана пад патрэбнасці Бел АЭС: у тэхнічныя ўмовы гэтай прадукцыі закладвалася павышаная бяспека.

— Прадугледжвалася тры ступені кантролю — матэрыялаў, тэхналогіі вырабу і канчатковага прадукту пры адгрузцы, — распавядае суразмоўнік. — Плюс дадатковы кантроль на самой атамнай станцыі. Мы атэсты і ліфты, і аўтакампаненты, і аўтатрактарная вытворчасць, сувязь, чыгунка, ваенная тэхніка, авіяцыя і касмічная галіна, радыёчастотныя кабелі як для тэлевізараў, так і для сродкаў спецсувязі... Напэўна, няма такіх галін, дзе мы на сённяшні дзень не прысутнічалі б.

Адзін з нядаўніх набыткаў ААТ «Беларускабель» — экструзійная лінія коштам 910 тысяч долараў. Абсталяванне ўнікальнае, у свеце яго выраблюць толькі тры кампаніі. Як падкрэсліваюць кіраўнікі прадпрыемства, лінія на 20 % павялічыць магутнасць завода і забяспечыць значны попыт на яго прадукцыю.

— Прадукцыя прызначана ў першую чаргу для флагмана ліфтабудавання, Магілёўскага ліфтабудаўнічага завода, — каментуе намеснік дырэктара па развіцці. — Інвестыцыйны праект дасць магчымасць выпускаць прынцыпова новы для беларускага рынку прадукт — плоскі ліфтавы кабель, і поўнасцю замясціць імпарт.

Апрасоўшчык кабеляў і правадоў пластыкатам і гумай Юрый КУНГЕР запускае выраб кабельнай прадукцыі разам са стажорам Дзмітрыем ПАУЛЕЧКАМ.

Прадавец Ганна НАДЗІНА раскладвае прадукцыю ў фірмовай краме ААТ «Беларускабель».

Фота Алены ДАЎЖАНОК

Пастаянная мадэрнізацыя дазваляе прадпрыемству распрацоўваць вытанчаныя тэхнічныя рашэнні пад задачы кожнага канкрэтнага заказчыка, улічваючы яго індывідуальныя патрабаванні і пажаданні.

— Абсталяванне ў нас шмат: на прадпрыемстве вырабляецца каля 30 тэхналагічных аперацый, — тлумачыць Дзмітрый Фіранчук. — Пакуль дакладзіш да абнаўлення агрошнага звяна тэхналагічнага ланцужка — час зноў мадэрнізаваць першае.

У нашы дні абсталяванне старэе хутка, распавядае ён. Так, калісьці тэхналагічныя лініі працавалі па 40 гадоў, але ж тады і прадукцыя не мянялася дзесяцігоддзямі. Цяпер новыя матэрыялы і тэхналогіі з'яўляюцца штогод, як і новая, больш энерганасычаная сыравіна. Даводзіцца трымаць руку на пульсе — галіна развіваецца дынамічна. Але такі падыход сябе апраўдвае.

— Цяпер у прадпрыемства больш за 50 % — імпартазамяшчальная інаваційная прадукцыя. І гэтую планку мы імкнёмся трымаць, — падкрэслівае спецыяліст.

Злева направа: электраманцёр Аляксандр СУХАНІЦКІ, інжынер-электронік Яўген КАШКАРОЎ, электраманцёры Яраслаў ФРАНЧУК і Іван БАЖКО разам з начальнікам энергетычнага ўчастка Андрэем МАРЦІНОВІЧАМ у вытворчым цэху.

ФОРМУЛА ПОСПЕХУ

Тэхнічны і тэхналагічны патэнцыял ААТ «Беларускабель» дае магчымасць распрацоўваць і вырабляць прадукцыю практычна пад любыя зададзеныя ўмовы. Так, сёння ў цэхах мазырскага завода выпускаюцца кабелі для мадэрнізацыі чыгункі Туркменістана.

— Гэта адзін з нашых новых напрамкаў, — адзначае дырэктар ААТ «Беларускабель» Віталь Шылаў. — Цесна працуем з Расіяй і Сярэдняй Азіяй, хочам замацавацца на рынку Афрыкі, ёсць напрацоўкі на Блізкім Усходзе. Вядзём перагаворы з Ізраілем, шукаем гандлёвага прадстаўніка, які дасць магчымасць пастаўляць прадукцыю ва ўсе краіны Блізкаўсходняга рэгіёна.

І тым не менш, каля 70–80 % экспарту прадпрыемства складае расійскі напрамак: з амаль 400 заводаў суседняй Расіі, што вырабляюць кабельную прадукцыю, толькі 3-4 могуць параўнацца з ААТ «Беларускабель» шырынёй наменклатуры.

— Да таго ж наш істотны плюс — хуткасць вырабу прадукцыі, — кажа Віталь Пятровіч. — Тое, на што нашы канкурэнты закладваюць 90–120 дзён, мы выпускаем у трыццацідзённы тэрмін. Гэта вялікая канкурэнтная перавага, дзякуючы якой заказчык выбірае нас, нават калі мы не можам даць яму перавагу па цэнавым фактары.

Хуткасць вырабу кабельнай прадукцыі можа мець вырашальную ролю ў шматлікіх сітуацыях. Напрыклад, арктычны кабель, які вытрымлівае тэмпературы да мінус 60 — мінус 70 °С, трэба было паспець вырабіць і даставіць на месца прызначэння да таго, як зіма спыніць навігацыю на «полюсе холаду». З Мазыра прадукцыя адправілася ў Мурманск і адтуль ледаколам — на Чукотку. Але хуткасць выканання не адмяняе найвышэйшую якасць, якую патрабуюць заказчыкі, бо кабелям, створаным у мазырскіх цэхах, часам трэба працаваць у экстрэмальных умовах. Напрыклад, вогнеўстойлівыя кабелі павінны ва ўмовах адкрытага гарэння (не менш за 750 °С) функцыянаваць мінімум 180 хвілін: пакуль ідзе эвакуацыя, шафа кіравання павінна працаваць. Заўважым, што ва ўмовах пажару спецыяльныя кабелі з мазырскіх цэхаў могуць пратрымацца цэлых 280 хвілін! Такая прадукцыя запатрабаваная ў нафтагазавай галіне. У лінейцы «Беларускабеля» таксама — безгалагеназамяшчальная вогнеўстойлівыя кабелі, якія пры гарэнні не вылучаюць шкодных рэчываў.

Намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце, кадрах і сацыяльных пытаннях Святлана ФЕШЧАНКА разам з майстрам энерга-механічнага ўчастка вытворчага цэха Ігарам ЯРМІНЫМ абмяркоўвае ўдзел працаўнікоў прадпрыемства ў культурна-спартыўным мерапрыемстве.

— Якасць — наш найважнейшы арыенцір. Па-іншаму нельга. У нас праходзяць штомесячныя тэхнічныя аўдыты. Нядаўна былі прадстаўнікі кампаніі «Раснафта», да гэтага — дэлегацыя «СІБУР», да гэтага — «Газпром», — кажа дырэктар ААТ «Беларускабель». — Мы з'яўляемся сертыфікаванымі пастаўшыкамі гэтых кампаній, а таксама «Лукойл» і «Уралкалій». І ўсе гэтыя прадпрыемствы да свайго тэхнічнага абсталявання ставяцца вельмі педантычна. Таму наша прадукцыя заўсёды на найвышэйшым узроўні: зарабіць рэпутацыю складана, а згубіць можна за адзін дзень.

Пастаянны пошук інавацыйных тэхналогій і новых відаў прадукцыі, якую не выпускае больш практычна ніхто, — крэда ААТ «Беларускабель».

— Асвойваем тэхналогію, якая ёсць на ўзбраенні толькі ў чатырох прадпрыемствaў СНД, мы будзем пятымі, — расказвае кіраўнік. — А таксама прапрацоўваем нашы пастаўкі для другой веткі БАМа. У будучыні плануем будаваць дадатковы корпус і пашырыць наменклатуру.

Дасягаецца ўсё гэта шмат у чым за кошт згуртаванай, высокакваліфікаванай каманды аднадумцаў. Дзякуючы калектыву, які ўдалося захаваць.

Апрасоўшчык кабеляў і правадоў пластыкатам і гумай Уладзімір ШАБАЛТАС робіць ліфтавыя кабелі і правады.

ЗАВОД — ГЭТА ЛЮДЗІ

Сёння «Беларускабель» працуе ў кругласутачным рэжыме, а ў цэхах прадпрыемства нясе працоўную вахту больш за 500 чалавек, амаль трэць з якіх — моладзь да 30 гадоў.

— Мы нацэленыя на тое, каб працаваць на нашым заводзе было не толькі прэстыжна, але і эканамічна выгадна, — адзначае Віталь Шылаў.

А значыць, неабходны і дастойны сацпакет, і, вядома, узровень заробку.

— Нам патрэбны эксклюзіўныя спецыялісты — такіх у краіне вельмі мала, — тлумачыць суразмоўнік.

Ліцейшчык пластмас Аксана АЛЬХА апрасоўвае відэлец у цэху сеткавых шнуроў.

Кабельная сфера ў плане падрыхтоўкі кадраў, можна сказаць, абдзеленая сістэмай адукацыі: ніводнай навучальнай установы, якая рыхтавала б спецыялістаў-кабельшчыкаў, у Беларусі няма. Таму кадры «Беларускабель» вучыць і гадуе непасрэдна ў працоўным калектыве. А для павышэння кваліфікацыі адпраўляе сваіх спецыялістаў у Маскву і нават у Новасібірск. І гэта мы гаворым аб тэхнічных спецыяльнасцях, падкрэслівае дырэктар. Але на рабочыя спецыяльнасці для кабельнай галіны таксама нідзе ў нашай краіне пакуль не вучаць. І такія прафесіяналы — літаральна на вагу золата.

— Прыемна, што на нашым прадпрыемстве з'яўляецца больш моладзі, — кажа кіраўнік. — Сёння маладыя людзі вяртаюцца ў рабочыя прафесіі. Мы набіраем іх вучнямі — у асноўным іх узрост 20–25 гадоў. Не ўсе застаюцца на прадпрыемстве, бо не кожны здольны асвоіць складаныя тэхналагічныя працэсы: трэба мець матэматычны склад розуму, неабходныя пачатковая хімічная адукацыя, здольнасць чытаць чарцёж. Таму кабельныя прадпрыемствы і сталічнікі ў людзей.

Але на ААТ «Беларускабель» цякучкі кадраў няма: у прадпрыемства ёсць загрузка магутнасцяў, дастойны ўзровень заработнай платы, сацыяльныя гарантыі. Акрамя таго, калектыў (жаночы і мужчынскі прыкладна напалову) жыве цікавым і насычаным жыццём — на тэрыторыі завода, акрамя сталовай і кулінарыі, дзе можна набыць харчовую прадукцыю ўласнай вытворчасці, пабудаваны спартыўны комплекс і клуб, на сцэне якога праходзяць самыя розныя мерапрыемствы. Пастаянна праводзяцца экскурсіі, а з прыходам цяпла — і турыстычныя выезды. **Сакратар ячэйкі БРСМ ААТ «Беларускабель» Андрэй МАРЦІНОВІЧ** адзначае, што моладзі ў працоўным калектыве камфортна: задавальняе і зарплата, і перспектывы прафесійнага росту, актыўна ажыццяўляецца маладзёжная палітыка. Стварэнне ўмоў для паспяховай самарэалізацыі моладзі, развіццё патэнцыялу маладых — адзін з прыярытэтаў для кіраўніцтва завода.

Дададзім, што на прадпрыемстве налічваецца каля 70 працоўных дынастый.

— Я працую на ААТ «Беларускабель» ужо больш за 30 гадоў і параіла сваёй дачцэ таксама прыйсці працаваць сюды, — распавядае **вядучы інжынер-тэхнолаг Алена ДАВІДОВІЧ.** — Працоўная дынастыя дае бацькам магчымасць падказаць і параіць, пакуль дачка або сын не напрацуюць уласны прафесійны вопыт. Праўда, і хвалююцца за працоўныя поспехі дзяцей бацькі нават больш, чым за самі сябе.

Многае робіцца для шматдзетных сем'яў работнікаў прадпрыемства, кажа **апрасоўшчык кабеляў і правадоў пластыкатам і гумай Юрый КУНГЕР,** бацька чацвярых дзяцей. Прадпрыемства падтрымлівае і грашовымі выплатамі да ўсіх значных дат, і арганізацыяй здароўка і карыснага вольнага часу малых і падлеткаў.

А яшчэ ААТ «Беларускабель» — «сем'яўтваральнае» прадпрыемства, як жартуюць работнікі. Напрыклад, у працоўным калектыве пазнаёміліся **Наталля і Станіслаў БАРКОВЫ**, цяпер ужо — маладая сям'я.

— Я — вядучы інжынер-тэхнолаг, а Наталля прыйшла на завод інжынерам-тэхнолагам, — кажа Станіслаў. — Але аблізіў нас сплаў на байдарках — мы абое паехалі на гэтае турыстычнае мерапрыемства, якое арганізоўвала наша прадпрыемства, і апынуліся ў адной байдарцы.

Па выніках спаборніцтва ў галіне сацыяльна-эканамічнага развіцця Мазырскага раёна за 2022 год ААТ «Беларускабель» атрымаў дыплом 2-й ступені і стаў найлепшым сярод прамысловых арганізацый Мазырскага раёна па ахове працы.

— Мы не спыняемся ў сваім развіцці, — кажа кіраўнік прадпрыемства Віталь Шылаў. — Сённяшнія задачы выкананы — значыць, заўтра трэба ставіць яшчэ больш высокую планку.

Кухарка Крысціна МАРКАВЕЦ дэманструе выпечку, якую гатуюць у сталовай прадпрыемства.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Лізаветы ГОЛАД.

УНП 400083186

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 20 июля 2023 года аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 357-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

№ предмета аукциона	Арендодатель имущества	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы (руб.)	Начальная цена права заключения договора аренды имущества/сумма задатка (руб.)	Наименование и целевое использование имущества
98	УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский, тел.: +37517 225-61-21, +37517 225-69-77	**г. Минск, пл. Привокзальная, 5А**	12,18	24,36 БАВ (411,68 руб.)	102,92	Площадь для организации розничной торговли продовольственной группой товаров и (или) непродовольственной группой товаров (книгами, канцтоварами, печатными изданиями, СМИ, полиграфической продукцией, сувенирной продукцией, размещение салона связи, торговля мобильными средствами связи или сопутствующими товарами, товаров для животных и другими товарами), кроме товаров, бывших в употреблении, товаров ритуального назначения, ломбардов, пиротехнических изделий, товаров интимного характера и лекарственных средств. **Срок аренды – 3 года**
99	УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений, тел. 8017 2256622	**Минская область, Минский район, участок дороги Минск-Молодечно км 762–км 786, ст. Радошковичи**	1,00	6,0 БАВ	4,23	Часть площади пола под размещение банкомата
100	Белорусский государственный университет, тел. 80172095522	**г. Минск, ул. Советская, 14**	6,75	3,0	14,26	Часть коридора первого этажа под размещение вендингового аппарата (прохладительные напитки в ПЭТ емкостях). **Срок аренды – 3 года**
101	УП «Жилье», тел. 8 (0177) 768532	**Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Серебренникова, 18-104**	21,20	2,0	89,57	Помещение под: 1) офис; 2) организацию торговли непродовольственной и (или) продовольственной группами товаров с ограничением по виду реализуемой продукции (за исключением винно-водочных изделий, пива, слабоалкогольных напитков, табачных изделий, табака, кальянов, электронных систем доставки никотина, жидкостей, используемых в электронных системах доставки никотина, и (или) без ограничения по виду реализуемой продукции); 3) оказание услуг (за исключением ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности). **Срок аренды – 3 года**
102		**Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Нормандия-Нёман, 149**	59,90	3,0	253,08	Помещение под: 1) организацию торговли непродовольственной группой товаров; 2) оказание услуг (кроме ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр, физкультурно-оздоровительной деятельности); 3) офис; 4) склад. **Срок аренды – 3 года**
103		**Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Чапаева, 33**	101,28	1,0	427,91	Помещение под: 1) размещение офиса; 2) организацию торговли непродовольственной и (или) продовольственной группами товаров; 3) оказание услуг (за исключением ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности); 4) склад. **Срок аренды – 3 года**
104		**Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Орджоникидзе, 57**	47,30	1,0	199,84	Помещение под: 1) организацию торговли непродовольственной группой товаров; 2) оказание услуг (кроме ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр); 3) офис. **Срок аренды – 3 года**
105		**Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Чапаева, 27**	154,85	1,0	654,24	Помещение под: 1) размещение офиса; 2) склад; 3) организацию торговли непродовольственной группой товаров; 4) оказание услуг (за исключением ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности). **Срок аренды – 3 года**
106		**Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Нормандия-Нёман, 10-73А**	35,40	3,0	149,57	Помещение под: 1) офис; 2) склад; 3) организацию торговли непродовольственной группой товаров; 4) оказание услуг (за исключением ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр). **Срок аренды – 3 года**
107		**Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр-т Революции, 11**	10,80	3,0	45,63	Помещение под: 1) организацию торговли непродовольственной группой товаров; 2) оказание услуг (за исключением ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности). **Срок аренды – 3 года**
108	УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский, тел.: +37517 225-61-21, +37517 225-69-77	**г. Минск, ул. Вокзальная, 26В**	5,76	11,52 БАВ (194,69 руб.)	48,67	Площадь под организацию розничной торговли продовольственной группой товаров и (или) непродовольственной группой товаров (книгами, канцтоварами, печатными изданиями, СМИ, полиграфической продукцией, сувенирной продукцией, размещение салона связи, торговля мобильными средствами связи или сопутствующими товарами, товаров для животных и другими товарами), кроме товаров, бывших в употреблении, товаров ритуального назначения, ломбардов, пиротехнических изделий, товаров интимного характера и лекарственных средств. **Срок аренды – 3 года**

Договор аренды заключается сроком **на пять лет**, если иное не указано в настоящей информации. Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.
Аукцион состоится **20 июля 2023 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 26 июня 2023 г. по 14 июля 2023 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Расчетный счет для перечисления задатка: BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – задаток для участия в аукционе **№ 357 от 20.07.2023** по предмету аукциона №.
Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»); Минского областного исполнительного комитета – **www.minsk-region.gov.by** (раздел «Аукционы по продаже недвижимости»). Телефон для справок +375 (17) 360 42 22

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Столбцовского филиала Минского областного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом

- **ЗДАНИЯ ГАРАЖА с инв. № 622/С-19062 общей площадью 850,7 кв. м,**
- **ЗДАНИЯ ДИСПЕТЧЕРСКОЙ с инв. № 622/С-18589 общей площадью 63,7 кв. м,**
- **ЗДАНИЯ БЕНЗОЗАПРАВКИ с инв. № 622/С-17926 общей площадью 16,1 кв. м,**

расположенных на земельном участке с кадастровым номером 625450100001003063 право аренды по 03.11.2063) площадью 0,5230 га по адресу: Минская область, г. Столбцы, ул. Свердлова, 11.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 280 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 28 000,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **31.07.2023 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.07.2023** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра 8 (044) 755-71-38.

УНП 600037767

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА унитарного предприятия «Белкоопнешторг Белкоопсоюза»

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2023.4.002.00056** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

Продавец: Торговое унитарное предприятие «Белкоопнешторг Белкоопсоюза» 220024, г. Минск, проезд Колодичи, уп. Бабушкина, 62, каб. 215, тел. +375 17 3887621

Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения повторных электронных торгов: 18 июля 2023 г. в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1, Кап. строение с. инв. № 255/С-15441 по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Слободкевичский с/с, аг. Слободка, ул. Ленинская, 35А, общей площадью 803,8 кв. м, наименование: здание магазина, назначение: здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: пристройка, покрытие, участок 1, участок 2, подпорная стена на земельном участке с кад. № 22088812660100049 7 площадью 0,1774 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Слободкевичский с/с, аг. Слободка, ул. Ленинская, 35А (право аренды), целевое назначение зем. участка – для обслуживания здания магазина. **Движимое имущество, стоп письменный,** инв. № 0000082746 – 1 шт., урна металлическая, инв. № 0000181102 – 2 шт., охранно-пожар. сигнализация, инв. № 0000181227 – 1 шт., шкаф холодильный, инв. № 0000181338 – 1 шт., оргнетушитель, инв. № 0000181355 – 3 шт., котел отопительный, инв. № 0000181375 – 1 комплект, замок навесной, инв. № 0000181395 – 9 шт., урна для сбора батареек, инв. № 0000181443 – 1 шт., прилавок глухой, инв. № 0000181715 – 6 шт., сейф металлический, инв. № 0000199286 – 2 шт., замок врезной, инв. № 0000199287 – 5 шт., прилавок откосленный, инв. № 0000199393 – 7 шт., раковина керамическая на пьедестале, инв. № 0000199436 – 1 шт., светильник 1-ламповый, инв. № 0000199441 – 23 шт., светильник дневного света 2-ламповый, инв. № 0000199449 – 2 шт., штаба дверная металлическая, инв. № 0000199455 – 6 шт., радиаторы отопления, инв. № 0000199456 – 1 шт., весы циферблатные, инв. № 0000199458 – 1 шт., решетка металлическая оконная малая 0000199506 – 4 шт., решетка металлическая оконная большая, инв. № 0000199507 – 16 шт., стол письменный однотумбовый, инв. № 0000199509 – 1 шт., куб, инв. № 0000199525 – 2 шт., стеллаж деревянный на 4 полки, инв. № 0000199694 – 1 шт., витрина холодильная молочная (регал), инв. № 0000199745 – 1 шт., банет, инв. № 0000199747 – 2 шт., система видеонаблюдения (монитор старого образца, видеорегистратор, камера вн. – 3 ед, камера нар. – 1 ед), инв. № 0000199749 – 1 шт., горка металлическая малая, инв. № 0000199752 – 1 шт., прилавок деревянный, инв. № 0000199754 – 4 шт., прибор пожарной сигнализации старого образца, инв. № 0000199755 – 1 шт., кондиционер «Баллу» большой 0000199757 – 1 шт., кондиционер «Баллу», инв. № 0000199759 – 1 шт., светильник дневного света, инв. № 0000199760- 7 шт., светильник обычный на 4 лампы, инв. № 0000199762 – 12 шт., прилавок на металлических ножках, инв. № 0000199768 – 2 шт., светильник настенный, инв. № 0000199777 – 2 комплекта, шкаф для одежды однодверный, инв. № 0000199780 – 1 шт., шкаф для одежды двухдверный, инв. № 0000199783 – 3 шт., шкаф двухдверный, инв. № 0000199784 – 1 шт., ведро пластмассовое 10 л, инв. № 0000199792 – 2 шт., стол кассира, инв. № 0000199795 – 1 шт., стеллаж деревянный на 3 полки по 3 пролета, инв. № 0000199797 – 2 шт., шкаф электрический большой, инв. № 0000199800 – 3 шт., перила металлические 6 м, инв. № 0000199805 – 2 шт., горка деревянная для книг старого образца, инв. № 0000199812 – 2 шт., козырек пластиковый, инв. № 0000199816 – 2 шт., вывеска «Азерно», инв. № 0000199829 – 1 шт., стеллаж деревянный (2 пролета), инв. № 0000199843 – 1 шт., шкаф деревянный старого образца, инв. № 0000199845 – 1 шт., режим работы пластиковый световой, инв. № 0000199847 – 1 шт., светильник-люстра на 4 плафона, инв. № 0000199849 – 22 шт., горка пристенная торговая на 4 полки, инв. № 0000199850 – 9 шт., стол для тканей, инв. № 0000199851 – 2 шт., подиум деревянный 5,0х15 м, инв. № 0000199852 – 2 шт., подиум деревянный 5,0х2м, инв. № 0000199853 – 1 шт., зеркало 1,4*0,6 м, инв. № 0000199854 – 1 шт., оборудование металлическое для ковровых изделий, инв. № 0000199855 – 1 шт., стол письменный 2 тумб., инв. № 0000199856 – 1 шт., прилавок деревянный для гвоздей старого образца, инв. № 0000199857 – 1 шт., стенд «Электронные отходы», инв. № 0000199858 – 1 шт., трап деревянный, инв. № 0000199859 – 16 шт., доска информации, инв. № 57930 – 1 шт., трап деревянный, инв. № 6332 – 9 шт.

Движимое имущество находится по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Слободкевичский с/с, аг. Слободка, ул. Ленинская, 35А.

Нач. цена: 173 126,77 бел. руб. с учетом НДС 20 %. **Задаток:** 17 312,67 бел. руб.

Повторные электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом организации и проведения электронных торгов на электронной торговой площадке имуществом, находящимся в торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по электронным торгам: **до 16.00 17.07.2023**.

Задаток по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MT8K30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901, Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Условия повторных электронных торгов: Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения; расходы Продавца на проведение независимой оценки, оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 15 (пятнадцати) раб. дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в следующем порядке: если между продавцом и покупателем (победитель торгов либо претендент на покупку) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуто соглашение по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, оплата за предмет электронных торгов должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. Расходы продавца на проведение независимой оценки – 384,00 бел. руб. с НДС. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 18.08.2022, 12.10.2022, 15.11.2022. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by/. Имущество, бывшее в употреблении. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения торгов, отказаться от проведения торгов. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом: Авраменко А.А. +375 29 751-77-74.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Бобруйский машиностроительный завод», 213805, г. Бобруйск, ул. К. Маркса, 235
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 (www.ipmtorgi.by)

Предмет электронных торгов (одним лотом), **назначенных на 28.07.2023**

Лот № 1
Адрес: **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Карла Маркса, д. 235 /1-7-1, 235**

В состав лота входит: **помещение заводоуправления 1801,3 кв. м** (помещение, не относящееся к жилищному фонду, инв. номер 710/D-83597), **склад энергоцеха 187 кв. м** (здание нежилое, инв. номер 710/С-7257), **навес 287 кв. м** (сооружение неустановленного назначения, инв. номер 710/С-4265), **вентиляционная мастерская 158,3 кв. м** (здание нежилое, инв. номер 710/С-7254), **склад кислорода сжатого 85,2 кв. м** (здание нежилое, инв. номер 710/С-7509).
Сведения о земельном участке: пл. 0,6672 га, предоставлен продавцу на праве долевого постоянного пользования (доля: 164791/200000) для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. После продажи земельный участок будет разделен в долях, что составит **1,5117 га**
Начальная цена (с НДС 20 %) лота № 1 – 828 840,00 бел. руб.
Дата и время начала и окончания электронных торгов по лоту № 1: 28.07.2023 с 11.00 до 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах** принимаются **по 27.07.2023 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Предмет повторных электронных торгов (одним лотом), **назначенных на 14.07.2023**

Лот № 2
Адрес: **Могилевская обл., г. Бобруйск, пер. Карла Маркса, д. 235**

Четыре емкости по 200 куб. м (сооружения неустановленного назначения по 28 кв. м – одна бетонная, три ж/бетонные, инв. № 710/С-6358, 710/С-6359, 710/С-6360, 710/С-6362).
Сведения о земельном участке: пл. 0,6672 га, предоставлен продавцу на праве долевого постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. После продажи земельный участок будет разделен в долях, что составит **0,1750 га**
Начальная цена (с НДС 20 %) лота № 2 – 44 548,92 бел. руб. (снижена на 50 %)
Предыдущее извещение по лоту № 2 опубликовано в газете «Звязда» от 20.05.2023
Дата и время начала и окончания электронных торгов по лоту № 2: 14.07.2023 с 11.00 до 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах** принимаются **по 13.07.2023 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены
Задаток 30 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет **BY47 BELB 3012 0029 5000 3022 6000** в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390
Срок подписания договора купли-продажи: 7 (десять) рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона
Условия оплаты предмета электронных торгов
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуто договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи
Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by).
Ответственность участника аукциона, его **права и обязанности, штрафные санкции** прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену
Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона по лоту № 1 – 1,5 %, по лоту № 2 – 5 % от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона
Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия
Контактные данные: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

УВАГА! ПАСТУПАЕМ У АСПІРАНТУРУ І ДАКТАРАНТУРУ

Учреждение образования
«ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ»

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ НА 2023 ГОД

за счет средств республиканского бюджета

Шифр	Специальность	Дневная	Заочная
	АСПИРАНТУРА		
01.01.05	Теория вероятностей и математическая статистика	1	–
01.04.05	Оптика	1	–
01.04.16	Физика атомного ядра и элементарных частиц	2	–
05.13.15	Вычислительные машины, комплексы и компьютерные сети	1	–
08.00.01	Экономическая теория	1	–
10.01.02	Русская литература	–	1
10.02.01	Белорусский язык	2	–
Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

Лот № 1. Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (фундамент – железобетон, стены, перегородки – 104 кв. м, процент готовности – 12 %) и земельный участок с кадастровым № 221288110101000134 площадью 0,1499 га для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, в частную собственность по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Шатуры, ул. Шистерова, 12.
Начальная цена предмета аукциона (в т.ч. не завершенный строительством жилой дом / зем. участок): **12 697,75** (3403,95/9293,80) бел. руб.
Задаток: 1269,77 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 26,81 %.
Лот № 2. Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (фундамент – бетон, площадь застройки – 60 кв. м, процент готовности – 12 %) и земельный участок с кадастровым № 221288110101000133 площадью 0,1500 га для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, в частную собственность по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Шатуры, ул. Шистерова, д. 10.
Начальная цена предмета аукциона (в т.ч. не завершенный строительством жилой дом / зем. участок): **11 109,93** (1809,93/9300,00) бел. руб.
Задаток: 1110,99 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 16,29 %.
Реквизиты для внесения задатка р/с: BY17 AKBB 3604 3141 1285 6200 0000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300962400, код платежа 40901. Получатель платежа: Октябрьский сельисполком.
Дата, время и место проведения аукциона: 31.07.2023 в 15.00 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и премера документов: с 8.30 28.06.2023 по 17.30 28.07.2023.
Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».
Условия для победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона: в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся вместе плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией права, ограничений (обременений) права на земельный участок; получить в установленном порядке разрешение Витебского районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий шесть месяцев с даты осуществления государственной регистрации права на земельный участок; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить возведение жилого дома в сроки, установленные Указом Президента РБ от 07.02.2006 № 87, выполнить вводо жилого дома в эксплуатацию в соответствии с действующим законодательством.
Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельном участке отсутствуют. Условия возможного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией.
Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ), которые в установленный в извещении срок подали заявление на участие в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона договор о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированным участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона. **Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона и оператор ЭПТ	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**)
Продавец	ООО «НаноПолимер», г. Минск, ул. Октябрьская, д. 16, к. 5. УНП 692142142

Предмет электронного аукциона (одним лотом)
Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16/5

Наименование	Общая площадь	Инвентар. номер	Назначение
Производственный корпус № 2	9 755,90 кв. м	500/С-53630	Здание специализир. для пр-ва машин и оборудования (машиностроения)

Составные части и принадлежности: проезды, площадки, подкрановые пути, дорожки, подпорные стены, бордюр 0,16, ограждения, ворота

Ливневая канализационная сеть	122,3 м	500/С-1029278	Сооружения специализир. коммунального хозяйства
Хозяйственно-бытовая канализационная сеть	305,6 м	500/С-1029274	
Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть	133,3 м	500/С-1029268	

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу для обслуживания здания специализированного для производства машин и оборудования (машиностроения) на праве временного пользования пл. **1,9448 га** (срок действия по 31.08.2029). **Ограничения (обременения)** прав на земельный участок: расположен в водоохранной зоне; в охранных зонах электрических сетей (пл. 0,0476 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,3316 га), канализации (пл. 0,0191 га), теплоснабжения (пл. 0,1005 га), объектов газораспределительной системы (пл. 0,0432 га)

Начальная цена лота с НДС 20 % – 12 210 000,00 бел. руб.

Обременения: площади здания частично сданы в аренду. Предмет аукциона находится в залоге у банка. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона

Задаток 10 000 бел. руб. перечисляется на р/с BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X; УНП 191224638; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победителя аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен действующим электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов вознаграждение в размере 1 % от цены продажи предмета электронных торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Рэспубліка» 03.06.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 14.07.2023 в 11.00. Окончание торгов: 14.07.2023 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 13.07.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: + 375 (17) 280 36 37; +375 (29) 317 95 42, info@ipmtorgi.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Гродно

11 июля 2023 года

№ лота	Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения	Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб.	Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб.	Сумма задатка, руб.
1	**Гродненская область, г. Гродно, ул. Ларисы Пляшенко, 15 (У-400, микрорайон «Заболоть») 440100000001007988**	0,0998	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение наружная площадь (площадь застройки): 174 (174) кв. м, Степень готовности 8 %. Фундамент: железобетон	367,30	34 092,30 (6 048,50; 28 043,80)	6 800

Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения в течение 10 рабочих дней; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «ГАГРЗК» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; в установленный срок продолжить строительство жилого дома. Затраты на организацию и проведение аукциона рассчитываются исходя из фактических затрат и доводятся до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись. Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: + 375 (152) 626055, 626056. http://gcn.by, Минская-Сенкевича/пер. Дворецкого, 1.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, код назначения платежа 40901, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится 11 июля 2023 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал). Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 26 июня по 5 июля 2023 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.

Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене не останется один участник, который не поднимает только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) **информирует об исключении** из состава реализуемого имущества на аукционе, назначенном на 06.07.2023, лота № 9 (Полуприцеп MAZ 93866, р/з 1130 АА-6, г. в. 1994. Нач. цена – 5 454,00 бел. руб. с учетом НДС). Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@iin.by. Извещение о проведении аукциона было опубликовано в номере газеты «Зв

Нам засталася спадчына

Кітабы, тафсіры, хамаілы...

Якія сакрэты адкрываюць рукапісныя кнігі беларускіх татар?

Татары на беларускіх землях пачалі сяліцца з канца XIV стагоддзя. Не трэба думаць, што гэта былі выключна ваяры. Амаль паўтара стагоддзя татары прыходзілі на землі Вялікага Княства Літоўскага з розных куткоў цюркскага свету, з нагайскіх стэпаў, Крыма, паўночнага Каўказа, Паволжа. Прыбывалі вялікімі групамі, з жонкамі і дзецьмі, няхітрым самейшым скарбам. Многія з іх былі выдатнымі земляробамі. Сяліліся перасяленцы асобнымі вёскамі, а ў гарадах і мястэчках маглі займаць асобны квартал ці вуліцу. Так, сёння ўжо мы ведаем як адзін з буйных татарскіх цэнтраў на беларускіх землях, але ў той час, як новыя жыхары прыбылі сюды, яны пасяліліся не ў самім горадзе, а ў яго ваколіцах. У Мінску недалёка ад Верхняга горада размяшчаліся так званыя Татарскія агароды, мясцовыя татары забяспечвалі горад свежай агароднінай.

Пісьмовая традыцыя

Пэўны час кампактнае пражыванне, шлюбы «паміж сваімі» садзейнічалі таму, што татары захоўвалі свае мову і культуру, але з цягам часу, каб кантактаваць з астатнім светам, ім даводзілася засвойваць мясцовы ўклад і гаворку. Усё ж не трэба забывацца, што яны заставаліся меншасцю ў асяроддзі, у якім апынуліся. Паступова адбывалася адаптацыя: сацыяльная, культурная, моўная. Ужо ў XIX стагоддзі нашчадкі першых пасяленцаў мала адрозніваліся ад беларусаў у вопратцы, хаты будавалі як усе, амаль не захавалі свой фальклор. А сёння наогул ёсць вёскі, назва якіх сведчыць, што іх заснавалі татары, але татар там не засталося.

Нягледзячы на тое, што ўжо з XVII стагоддзя татары інтэграваліся, перайшлі на мясцовую мову, яны змаглі зберагчы сваё пісьменства. Яшчэ падчас першых перасяленняў паміж татарамі і князямі ВКЛ была заключана дамова на дазвол захаваць сваю веру. Для мусульман важна было мець свяшчэнныя кнігі, якія яны старанна перапісвалі. Пісьмовая спадчына перадавала і традыцыйныя каштоўнасці. Перапісваўся не толькі Каран, тэксты малітваў, апісанні мусульманскіх рытуалаў і абавязкаў, але і цікавыя ўсходнія сюжэты, казкі, легенды і апавяданні, парады па лячэнні хвароб. Кніжнасць мясцовых татараў была выключна рукапіснай, арабаграфічнай. Тэксты пісаліся адпаведна ўсходняй традыцыі — справа налева.

Такая традыцыя дажыла да нашых дзён. Нават калі ўжо не было праблем набыць друкаваны Каран, вернікі лічылі сваім рэлігійным абавязкам яго перапісаць. Зусім нядаўна сышлі з жыцця старыя людзі, якія ад рукі пісалі хамаілы, кітабы. Сёння можна знайсці ў многіх татарскіх сем'ях малітоўную літаратуру. Тафсіры неабходны былі для разумення Карана, змяшчалі пераклады і каментары.

Важнае адкрыццё

Самымі ж каштоўнымі крыніцамі для славістаў сталі кітабы. Значная частка з іх была запісана на славянскіх мовах: беларускай, польскай. Даследчыкі высветлілі, што для гэтага пісьменства быў створаны своеасаблівы варыянт арабскага алфавіта, былі ўведзены дадатковыя літары для таго, каб пазначыць некаторыя гукі, якія адсутнічалі ў арабскай мове.

Калі параўноўваць тэксты, створаныя ў розныя стагоддзі, можна заўважыць, як мяняецца арфаграфія, як спецыфічна выкарыстоўваліся тыя ці іншыя літары, што дазваляе рабіць датаванне тых тэкстаў, на якіх няма пазнак пра час стварэння альбо пра тое, як перамяшчаліся татары. Часам перапісчык уносіў змены адпаведна мове, на якой размаўляў, перадаваў фанетыку свайго рэгіёна, дыялектныя асаблівасці.

Сёння вядома пра сотні рукапісных крыніц мясцовых татар, і пошук дзі фіксацыя папярэвых помнікаў працягваецца. Кашто ўнымі могуць быць не толькі старажытныя рукапісы, але і тыя, што, напрыклад, зроблены ў 80-х гадах мінулага стагоддзя, бо іх стваральнікі маглі перапісаць тэксты з больш старых арыгіналаў, якія маглі існаваць нават у мінулых стагоддзях, але да нашага часу не дайшлі.

Упершыню даследчыкі звярнулі ўвагу на пісьмовую спадчыну літоўскіх татар (маецца на ўвазе гістарычная назва насельнікаў Вялікага Княства Літоўскага) у XIX стагоддзі, але найбольш запатрабаванымі ў навукоўцаў татарскія манускрыпты сталі ў XX стагоддзі. Так, у 1915 годзе Іван Луцкевіч знайшоў кітаб, які

захоўваецца сёння ў Літве, у бібліятэцы Вілейскага ўніверсітэта. З дапамогай нямецкага арыенталіста (згадаем, што ішла Першая сусветная вайна) ён змог прачытаць рукапіс. Калі тэкст загучаў, Луцкевіч пачуў родную мову. Аказалася, што рукапісная спадчына мясцовых татар змяшчала тэксты на той мове, на якую перайшлі яе карыстальнікі, больш за тое, у такіх крыніцах захоўваліся асаблівасці гаворак тых рэгіёнаў, дзе жылі людзі, якія гэтыя кнігі пісалі. Луцкевіч надрукаваў фрагменты. І гэта была «бомба». Навукоўцы пачалі актыўна займацца даследаваннем татарскіх рукапісаў. Адкрылася акенца, якое дазваляла даведацца, як гучала мова ў XVII—XVIII стагоддзях, тым больш што друкаваных крыніц, якія датычацца гэтага часу, захавалася вельмі мала. Да таго ж арабскім пісьмом выдатна перадавалася фанетыка беларускай мовы.

Пошук

Нягледзячы на тое, што многія навукоўцы, айчыянныя і замежныя, звярталіся да рукапісных спадчыны мясцовых татар, як заўважае кандыдат філасофскіх навук, кітабіст Ірына Сынкова: «Яшчэ не даследавана мора». Тут карысную інфармацыю могуць знайсці спецыялісты ў розных галінах: філолагі, мовазнаўцы, рэлігіязнаўцы, культуролагі, гісторыкі. З рукапісаў, якія стваралісь на нашых землях, можна даведацца не толькі пра духоўны свет татар, але і пра асяроддзе і час, у якім яны жылі. Напрыклад, чаму не зацікавіцца прыпіскамі, якія даваліся побач са знакарскімі тэкстамі? Так можна даведацца, як на землях ВКЛ называлі хваробы.

Рэлігійна палемічныя творы XVII стагоддзя сведчаць, што татары сачылі за палемікай, якая ўзнікала паміж праваслаўнымі, каталікамі, ёўдзеямі. Рукапісная спадчына падкажа, як культуры розных народаў уплывалі адна на другую. Часам трапляюцца арыгінальныя рэчы, калі ў тэксты ўплятаюцца запазычаныя сюжэты і нават рэалії, характэрныя для часу, у які жыў той, хто іх пісаў. Напрыклад, у сюжэце, які адбываецца быццам на казачным Усходзе, герой можа звярнуцца да... фінінсектара. Адно слова адразу дае падказку на час стварэння твора...

Вельмі важна, каб да даследавання рукапіснай спадчыны беларускіх татар спрычыніліся разнапланавыя даследчыкі (арабісты, славісты, культуролагі, гісторыкі, філолагі). Іх супраца дазволіць рабіць новыя адкрыцці, прасоўваць шлях рукапісу.

Пры Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі створаны сектар усходазнаўства, які прыкладае намаганні для прыцягнення ўвагі даследчыкаў да рукапісной спадчыны беларускіх татар. Ён праводзіць канферэнцыі, круглыя сталы і заняткі, на якіх можна навучыцца чытаць славянскія тэксты, напісаныя арабскім пісьмом.

Але трэба клапаціцца і пра тое, каб рукапісы не знікалі . Часам у экспедыцыях даследчыкі знаходзяць іх у даволі гаротным стане альбо даведваюцца, што нашчадкі павыкідалі тыя кнігі непатрэбную паперу. Нават калі стары манускрыпт, закінуты на гарышча, напалову спарахнеў ці паедзены мышамі, ён яшчэ можа акazаць карысным для даследчыкаў. Раптам сярод захаваных фрагментаў схаваны адказы на пытанні, як развівалася мова і чым жыло насельніцтва пэўнага рэгіёна? Нават пашкоджаныя рукапісы можна перадаць вучоным, у музеі, бібліятэкі, у тым ліку рэгіянальныя. Для даследчыкаў важна зафіксаваць змест такіх крыніц, кім можна адфатаграфаваць ці перазняць на лічбавым сканеры (ні ў якім разе не на кераксе, бо той псуе паперу). І тады напісанае застанецца для гісторыі, для навукі і для памяці пра тых, чыёй рукой былі зроблены гэтыя радкі.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Архіўны дэтэктыў

ТАЯМНІЦЫ ФОНДУ АЛЯКСАНДРА ЕЛЬСКАГА

У яго калекцыі быў аўтограф секунданта Лермантава

Аляксандр Ельскі — пісьменнік, публіцыст, краязнавец, збіральнік дауніны і стваральнік музея, выдатны гаспадар-аграрнік, жыў у в. Замосце на Ігуменшчыне, што ў сучасным Пухавіцкім раёне. Нарадзіўся 16 чэрвеня 1834 года ў суседнім Дудзічах у сям'і харунжага Ігуменскага павета Карла Ельскага і Людзікі Штайнберг. Пачатковую адукацыю атрымаў у нямецкай школе ў Ласдзэнэе — цяпер г. Краснаznаменск Калінінградскай вобласці. Відавочна, што там жылі блізкія сваякі, якія і прынялі пад апеку Аляксандра. Класічную гімназію юнак скончыў у Мінску ў 1852 годзе, пасля чатыры гады быў на вайсковай службе, удзельнічаў у Крымскай вайне. У чыне паручніка выйшаў у адстаўку і пасяліўся ў спадчынным фальварку ў в. Замосце. У 1858 г. пабраўся шлюбам з Аленай Калачынскай, з якой меў сына Яна і дачку Аляксандру. У Мінскай губерні быў вядомым гаспадаром: вялікую ўвагу ўдзяляў культуры земляробства, меліярацыі глебы, догляду лесу, развядзенню рыбы, а таксама закладу парк, сад і пабудаваў цагельню. З 1861 года быў міравым суддзяй другой акругі Ігуменскага павета, у 1882—1887 — членам апякунскага камітэта пры рэальным вучылішчы ў Мінску, а з 1901 г. — ганаровым куратарам павятовага Таварыства ўзаемастрахоўкі ад пажару.

Літаратурна-публіцыстычная дзейнасць Аляксандра Ельскага была надзвычай плённай. Вядома, што ён супрацоўнічаў больш чым з 20 перыядычнымі выданнямі, напісаў звыш 10 тысяч гісторыка-краязнаўчых артыкулаў пра Беларусь. Удзельнічаў у археалагічных з'ездах у Вільні ў 1893 г. і Рызе ў 1896 г. А ў 1864 г. заснаваў у Замосці краязнаўчы музей, які меў надзвычайную папулярнасць сярод вучоных таго часу. Замасцянская калекцыя Аляксандра Ельскага налічвала звыш 60 карцін вядомых беларускіх і заходнееўрапейскіх мастакоў, 2000 гравюр, калекцыі фарфору, шкла, слуцкіх паясоў, каля 20 тысяч аўтографаў і дакументаў выдатных дзеячаў літаратуры, мастацтва, навукі, дзяржаўных і ваенных дзеячаў. Асобна варта згадаць замасцянскую бібліятэку, якая пад канец жыцця пісьменніка налічвала больш як 10 тысяч кніг. Каштоўнасць яе складалі старадрукі, літоўска-беларускія хронікі, энцыклапедыі, вопісы архіваў, багатыя матэрыялы па беларусістыцы і многае іншае.

Аляксандр Ельскі памёр 10 верасня 1916 года. Пахаваны на радзіме, у в. Дудзічы. Яго багатыя музейныя калекцыі і бібліятэка па волі лёсу раскіданы па многіх сховішчах суседніх краін, а магчыма, і далёкіх. А ў Беларусі толькі 30 адзінак з яго дваццацітысячнай калекцыі. І шлях іх вяртання быў незвычайны.



АРХІЎНЫЯ РЭАЛІІ

31 ліпеня 1962 года Цэнтральны дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва БССР (сучасны Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва) прыняў на захаванне ад Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці «дакументальныя матэрыялы асабістага фонда беларускага пісьменніка і публіцыста А. К. Ельскага» разам з усімі ўліковымі дакументамі да яго. Даволі працяглы час фонд быў недаступны для шырокага выкарыстання. Толькі ў 1976 годзе прайшла яго навукова-тэхнічная апрацоўка. Тытульны ліст навастворанага вопісу інфармаваў карыстальніка аб тым, што перад ім фонд асабістага паходжання. Адлюстроўвалася гэта і ў яго назве «Ельскі Аляксандр Карлавіч (1834—1916) — этнограф, гісторык, пісьменнік, перакладчык, даследчык беларускага фальклору». Уласна вопіс налічвў 30 адзінак захоўвання, якія былі заключаны ў раздзелы: «Лісты да А. К. Ельскага», «Лісты розных асоб да розных асоб», «Дакументы розных асоб», «Дакументы аб грамадскай дзейнасці А. К. Ельскага». Зразумела, што многія даследчыкі гісторыі культуры і літаратуры дзесяцігоддзя стагоддзя сталі звяртацца да «асабістага фонду Аляксандра Ельскага». Але спадзяванні на інфарматыўныя крыніцы аб жыцці і дзейнасці адnаго з яго яркіх прадстаўнікоў былі дарэмнымі. Іх выпадковасць і малазначнасць у гэтых адносінах была відавочная.

У 1999 годзе Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры была арганізавана навукова-практычная канферэнцыя «Універсітэты Ельскіх», прымеркаваная да 165-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага. Па выніках гэтай канферэнцыі быў выдадзены зборнік матэрыялаў «Дзеля блізкіх і прышласці». Пры знаёмстве з артыкуламі зборніка, здзівіла тое, што пра асабісты фонд Ельскага і яго дакументы ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва ніводзін аўтар не згадваў. Дык што за дакументы захоўваюцца ў архіве? І няўжо няма ў фондзе Ельскага хаця б адзінай крыніцы, на якую варта было б звярнуць увагу, даследуючы яго жыццё і дзейнасць?

САКРЭТЫ «СПРАВЫ ФОНДУ»

Першыя крокі да разгадкі таямніцы дапамаглі зрабіць дакументы «Справы фонду», якая і ўтрымлівае згаданыя вышэй уліковыя дакументы. У нашым выпадку гэтая справа адлюстравала не толькі ўлік дакументаў фонду, але і ўсю гісторыю іх перамяшчэння ў прасторы і часе.

«Справа фонду» пачынаецца з вопісу ад 31 сакавіка 1936 года «Материалов, поступивших в Государственный литературный музей через полпредство в Варшаве коллекции писем и автографов Ельского А. К. /в обложках из жёлтой бумаги с объяснительными записями на польском языке/». Вопіс зафіксаваў 31 аўтограф. У маскоўскім Літаратурным музеі «Коллекция писем и автографов Ельского А. К.» знаходзілася да 1941 года. Пастановай СНК СССР ад 29 сакавіка 1941 года быў створаны Цэнтральны дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва СССР — знакамітыя ЦГАЛІ, і адпаведна гэтай жа пастанове Дзяржаўнаму літаратурны музей перадаў навастворанаму архіву значную колькасць дакументальных помнікаў, у тым ліку і калекцыю А. Ельскага. Архіўны вопіс на дакументы Ельскага складзены толькі ў 1949 годзе. Менавіта ў час іх першай навуковай апрацоўкі і была дапушчана памылка пры фандаванні. Традыцыйная практыка вымагала стварэння фонду асабістага паходжання, і першапачаткова відавы тэрмін «калекцыя» не быў улічаны, як і не былі ўзяты пад увагу асаблівасці афармлення вокладак і надпісаў на іх. «Справа фонду» таксама мае той першы рукапісны вопіс, на тытульным лісце якога стаіць назва «Ельский Александр Карлович (1834—1916), белорусский краевед, писатель, публицист». Заўважу, што названы вопіс мае тую ж сістэматызацыю, якая намнога пазней амаль цалкам будзе ўжыта ў практыцы літаратурнага архіва ў Мінску.





У 1955 годзе Галоўнае архіўнае ўпраўленне СССР Міністэрства ўнутраных спраў СССР выдала распаражэнне аб перадачы некаторых фондаў нацыянальных дзеячаў пад апеку Архіўных упраўленняў саюзных рэспублік. У хуткім часе, адпаведна з гэтым распараджэннем, Архіўнае ўпраўленне МУС БССР атрымала ад ЦГАЛІ СССР фонд Аляксандра Ельскага. Першапачатковым месцам захоўвання фонду быў вызначаны Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, дзе ён і знаходзіўся да перадачы ў 1962 годзе Цэнтральнаму дзяржаўнаму архіву літаратуры і мастацтва БССР.

ТАЯМНІЦЫ ПАД УЛАСНАЙ ПЯЧАТКАЙ АЛЯКСАНДРА ЕЛЬСКАГА

Візуальнае знаёмства з адзінкамі захоўвання фонду Ельскага адразу схіліла да думкі, што перад намі ні што іншае, як частка калекцыі аўтографаў, сабраная Аляксандрам Ельскім у Замосці, — з дваццаці тысяч усяго толькі трыццаць. Для гэтай калекцыі збіральнікам былі выраблены адмысловыя папкі. На кожнай папцы каліграфічным почыркам вялікімі літарамі выпісаны прозвішча і імя ўладальніка аўтографа, нiжэй — род яго заняткаў. Пад надпісам стаіць уласная пячатка, якая сцвярджае, што гэты дакументальны помнік належыць «Бібліятэцы і музею старажытнасці Аляксандра Ельскага». Кожная папка мае ўнутраную вокладку, дзе яшчэ раз пазначана прозвішча і кароткая біяграфія ці нават характарыстыка таго, чый аўтограф упрыгожыў замасцянскую калекцыю.

Як сведчыць фонд, калекцыю складалі самыя розныя дакументы: лісты з асабістай перапіскі, афіцыйныя дакументы з подпісамі вядомых асоб, асабістыя даведкі ці проста ўласнаручны подпіс на чыстым лістку паперы. Знаёмячыся з кожным з гэтых аўтографаў і ўсімі запісамі А. Ельскага, заўважаецца ўпэўненасць, што збіральнік усіх гэтых людзей ведаў асабіста ці меў зносіны праз перапіску. Многія ж маглі бываць у Замосці і, ведаючы пра захапленне гаспадара дому, пачалі за гонар пакінуць у яго калекцыі свой аўтограф.

АСОБЫ ЗАМАСЦЯНСКАЙ КАЛЕКЦЫІ АЎТОГРАФАЎ

Аляксандр Іванавіч Арлоў — яго подпісы на двух пасведчаннях вучня Ігнацы Аскеркі аб пераводзе апошняга ў наступныя класы Мінскай губернскай гімназіі. Датуюцца 1839 і 1840 гадамі. Арлоў быў дырэктарам вучылішча ў Мінскай губерні. Прысутнічае тут і візітная картка Арлова, якую Ельскі мог атрымаць ад самога «мінскага педагога». Праз некалькі спраў захоўваецца папка з аўтографам ваеннага дырэктара вучылішчаў Мінскай губерні — *Дзянісцкага Міхаіла Георгіевіча*. Яго аўтограф стаіць на білеце вучня 5 класа Мінскага дваранскага пансіёна Іосіфа Ельскага на звальненне ў адпачынак у снежні 1853 года. Іосіф Ельскі, магчыма, малодшы брат Аляксандра Ельскага, у будучыні расійскі ваенны дзеяч. Значнае месца ў ліку аўтографаў займаюць імёны вядомых вучоных. Сярод іх *Канстанцін Іванавіч Арсенньеў* (1789—1865) — рускі гісторык, статыстык, географ, *Васіль Іванавіч Більбасаў* (1837—1904) — гісторык, педагог, публіцыст, прафесар універсітэта св. Уладзіміра ў Кіеве, рэдактар ліберальнай газеты «Голас», *Канстанцін Сцяпанавіч Весялоўскі* (1819—1901) — рускі эканаміст, географ і кліматолаг, сапраўдны член Акадэміі навук. Цікавым у гэтым шэрагу з'яўляецца аўтограф *Паўла Аляксандравіча Віскаватава* (1842—1905), рускага пісьменніка, літаратуразнаўца, прафесара рускай славеснасці Дэрпцкага ўніверсітэта, біёграфа Лермантава. У збор Ельскага трапіў ліст Віскаватава да *Мар'яна Здзяхоўскага* (1861—1938), напісаны 9 лютага 1885 года Мар'ян Здмундавіч Здзяхоўскі, вядомы літаратуразнавец, публіцыст, філосаф, палітолаг, ураджэнец в. Ракаў, што на Валожыншчыне, вучыўся ў Пецярбургскім і Дэрпцкім універсітэтах, дзе і мог пазнаёміцца з Віскаватавым. Працягам іх добрых узаемаадносін стала ліставанне. Аляксандр Ельскі добра ведаў Здзяхоўскага, гасцінна прымаў яго ў сваім доме. «З сардэчнасцю вяскі павазу павагу і глыбокае прызнанне шаноўнаму Аляксандру Ельскаму, які нашаму грамадству ў Літве і Русі служыць узорам не толькі працы, але і глыбокага спасцiжэння духу народа і яго маральных і разумовых патрэб». Такія словы пакінуў Здзяхоўскі ў «Кнізе для запісу наведнікаў збораў у Замосці» 30 жніўня 1902 года. Магчыма, праз Віскаватава і Здзяхоўскага трапіў у калекцыю і аўтограф князя *Аляксандра Ігарыевіча Васільчыкава* (1818—1881), вядомага рускага грамадскага дзеяча і пісьменніка, пачынальніка кааператыўнага руху ў Расіі. Яго жыццё было поўным прыгод. У 1840 г. кн. Васільчыкаў пачаў ваенную службу на Каўказе ў адміністрацыі барона Гана. А 13 ліпеня 1841 г. быў секундантам пры дуэлі Лермантава і Мартынава. За ўдзел у дуэлі аддадзены ваеннаму суду, але памілаваны імператарам «во внимание к заслугам отца». Аўтограф князя — гэта яго ліст на французскай мове да графа Шувалава (1827—1889).



Асобнае месца ў калекцыі Ельскага займаюць імёны *Ксенафонта Антонавіча Гаворскага* (1821—1871) і *Адама Карлавіча Кіркора* (1818—1886). Гаворскі вядомы як беларускі гісторык, археолаг, выдавец. Працаваў у Полацкай духоўнай семінарыі, рэдагаваў неафіцыйную частку «Витебских губернских ведомостей», быў рэдактарам часопіса «Вестник Западной России». Адзін з пачынальнікаў заходнерусізму. Менавіта з яго аўтографамі ў названай калекцыі звязана імя больш вядомага і шанаванага беларускага гісторыка, этнографа, археолага, публіцыста, выдаўца, грамадскага дзеяча Адама Кіркора. У свой час Адам Кіркор перадаў Аляксандру Ельскаму значную частку свайго архіва, у асноўным лісты з асабістай перапіскі. Некаторыя лісты карэспандэнтаў Кіркора былі ўключаны ў калекцыю, у тым ліку тры лісты Гаворскага, дасланыя ў 1864—1865 гг.

Несумненную цікавасць маюць лісты да Адама Кіркора і некаторыя іншыя дакументы гісторыка *Мікалая Іванавіча Кастамарава* (1817—1885) і славіста, этнографа і археолага *Аляксандра Аляксандравіча Катлярэўскага* (1837—1881). Усе яны сталі часткай калекцыі аўтографаў Аляксандра Ельскага.

Даследчык не будзе расчараваны. Кожны, хто вывучае жыццё і дзейнасць вядомых асоб мінулага, выявіць у захаванай больш чым праз стагоддзе невялікай частцы калекцыі Аляксандра Ельскага, што сёння належыць Беларускаму дзяржаўнаму архіву-музею літаратуры і мастацтва, свае цікавыя крыніцы.

Ганна ЗАПАРТЫКА

Летні сезон

У чым захапляць на далёкіх і мясцовых вадаёмах?

Выбар пляжных аксесуараў

Як кожная зіма ставіць перад намі актуальнае пытанне выбару правільнага пухавіка, так доўгачаканы прыход летняй спякоты непазбежна цягне за сабой задачу выбару купальніка — не менш, а, мабыць, і больш складаную, чым першая. Бо купальнік — гэта ж гісторыя пра шчырасць: увесці ў зман і схаваць лішняе тут вельмі і вельмі няпроста.

А да таго ж ёсць яшчэ і мода, слушак якой — дызайнераў і стылістаў, нягледзячы на бодзіпазітыў і заклікі «прымаць сябе», — відавочна, натхнае толькі мадальная знешнасць: высокія, худыя, звілістыя «страйняшкі», глянцавыя анёлы, што адным капусным лісцікам сілкуюцца. У жыцці такіх практычна не бывае. Так што будзем выходзіць з рэалій і адаптаваць фантазіі дызайнераў да таго, як увогуле выглядае жывая жанчына...

Але пакінем убаку лірыку: давайце паглядзім, што ў модзе ў гэтым пляжным сезоне. Пляжным без перабольшання, нават калі ў гэтым адпачынку вы не збіраецеся «на моры»: у Беларусі стабільныя +28—+30, пляжы добраўпарадкаваны, вадаёмаў у нашай Сінявокай дастаткова і на большасці (асабліва ў выхадныя) няма дзе яблыку ўпасці — не тое што покрыва раскласці. Так што ёсць дзе паўстаць у модным пляжным вобразе.

КАБ ТАЕМНАЕ НЕ СТАЛА ВІДАВОЧНЫМ

Быў час, калі залішне смелых дам штрафавала паліцыя за тое, што штаны іх смешных купальных касцюмаў заканчваліся на далонь вышэй калена. Пазней прыдумалі бікіні, і гэтае «бязладдзе» зрабіла ў грамадстве эфект выбуху. Адгэтуль, дарэчы, і назва: на вострае Бікіні ўпершыню выпрабавалі ядзерную бомбу незадоўга да таго, як французскі дызайнер Луі Рэар прадставіў публіцы раздзельны купальнік («самы маленькі купальны

Танкіні — камбінацыя топа і плавак.

гарнітур у свеце», як абвяшчала рэклама). Па цяперашніх мерках купальнік быў вельмі сціплы, а тады яго яшчэ шмат гадоў пасля паказу не адважваліся насіць нават самыя смелыя паненкі. Але блюсчучая Сафі Лярэн праклала гэтай «падыумнай навінцы» шлях у масы. Ішоў час, раздзельны купальнік усё «раставаў» і памяншаўся, да дзевяностых-двухтысячных ператкрыўшыся ў дзве выровачкі, якія галізну не затуляліся, а хутчэй падкрэслівалі. А далей, па законах раўнаваргі, усё пайшло ў іншы бок. Велізарная колькасць аголенага цела надакучыла жанчынам і перастала дзівіць уяўленне мужчын, а дызайнеры сталі вынаходзіць усё больш закрытыя купальныя гарнітуры. Да таго ж анколагі забілі трывогу: маўляў, праз мерны загар шкодны, і нашы прапрабабулі, якія аддавалі перавагу белай скуры перад загарэлай, ічылі так небеспадстаўна. Словам, у апошнія гады загараць на пляжы ўжо не модна, эфект «курыцы-грыль» лічыцца маветонам, а купальнік становіцца ўсё больш сціплым і ці спосабу хоць трошкі прыкрыць «тое, пра што нязручна казаць» ператвараецца ў аснову стыльнага вобраза.

БУРКІНІ І ТАНКІНІ

Сёлета немагчыма не звярнуць увагу на мадэлі купальнікаў з доўгім рукавом. Тут можна прасачыць відавочныя адсылкі да буркіні — купальнага касцюма для мусульманак. Калі вы адпачывалі ў мусульманскіх краінах, магчыма, звярталі ўвагу на гэты пляжны ўбор. Яго асаблівасць у тым, што ён закрывае ўсё цела і галаву, пакідаючы адкрытымі толькі твар, ступні і кісці рук. Пры гэтым, паколькі касцюм пашыты з эластычнай тканіны, ён не скоўвае рухаў. Супермодны купальнік

Мадэлі купальнікаў з доўгім рукавом вырашаюцца пераважна ў стылі «спортшык».

гэтага лета падразумявае топ з доўгімі рукавамі (таксама эластычны, які не скоўвае рухаў) і асобную ніжнюю частку рознай стylістычнай прыналежнасці: да талій ці на сцёгнах, але ногі застаюцца адкрытымі для сонца. Хоць досыць на подыумах было прадстаўлена і злітных мадэляў купальнікаў з доўгімі рукавамі. У гэтым сезоне такія купальнікі — пераважна ў стылі «спортшык» і нагадваюць форму для фітнесу. Адна з топавых дэталяў — зашпілька-маланка на грудзях.

Уласна, ідэя «ну вельмі закрытага купальніка» не новая — ужо гады чатыры такія купальнікі крочаць па подыумах. Але толькі цяпер яны паступова прыходзяць на пляжы. Хоць нашы жанчыны іх пакуль не ацанілі. Можа быць, таму, што сонечных дзён у Беларусі не надта шмат і хавацца ад ультрафіялету ў нашых шыротах зусім не хочацца. У купальнікаў з доўгім рукавом, заўважым, ёсць плюсы: па-першае, калі вы не фанат загару або калі загар вам не рэкамендуецца па медыцынскіх паказаннях, яны абароняць скуру лепш за крэм з SPF і пры гэтым цела будзе «дыхаць», а па-другое, надзеньце з такім купальнікам штаны ці спадніцу, і ніхто на вашым працоўным месцы не здагадаецца, што падчас абедзённага перапынку вы выпрашлі збегаць выкупацца.

Да тэмы сціпласці і камфорту мае дачыненне і танкіні — гэты варыянт таксама на подыумах ужо гадоў пяць і сёлета нарэшце знайшоў шлях на нашы пляжы. У адрозненне ад купальнікаў з доўгім рукавом, танкіні можна назіраць на нашых дзяўчатах на тым жа Мінскім моры. Гэта камбінацыя топа і плавак. Даўжыня вар'іруецца, фасонаў — маса, пераважна — зручнасць і свабода рухаў: нічога ніадкуль не вывалівацца, нават калі вы будзеце катацца з горак у аквапарку або бегаць у дагонялкі з дзецьмі. І нагоп, чым менш мы паказваем, тым прасцей схаваць тое, што паказваць не хочацца: ад валіжкі на руках да складачак на таліі. У трэндзе гэтым летам таксама злітныя купальнікі, пераважна ў стылі мінімалізм: ніякіх размернасцяў, толькі элегантнасць і стыль. Самыя выгадныя мадэлі злітных купальнікаў гэтым летам альбо чорныя, альбо белыя: манахромны вобраз «збярэ» фігуру і зробіць постаць больш зграбнай.

ПА КЛАСІЦЫ І НЕ ТОЛЬКІ

Класічны раздзельны купальнік (уласна, той гарнітур, які мы прывыклі зваць купальнікам), зрэшты, таксама нікуды не дзеўся. Але і ён гэтым летам стаў прыкметна больш сціплым. Модныя мадэлі такіх купальнікаў ужо не першы сезон падразумяваюць высокія плаўкі. І калі ў 2017-м, з'явіўшыся, такі купальнік многім здаваўся дзіўным, сёння купальны касцюм з высокімі трусікамі і дастаткова закрытым бюстам стаў дазавай мадэллю. Тым больш што плаўкі да таліі выдатна карэкціруюць лінію сцёгнаў і хаваюць жывоцік. А высокія выразы на сцёгнах візуальна робяць ногі даўжэйшымі.

Зрэшты, звыклая пасадка раздзельнага купальніка — плаўкі на сцёгнах і досыць адкрыты ліф — класіка па-за часам. Менавіта такіх купальнікаў на беларускіх пляжах больш за ўсё: нашы кансерватыўныя дзяўчаты не спяшаюцца бегчы за модай, і гэта разумна.

У гэтым сезоне класіку «асучасніваюць» ***прынты***: ад бананавага лісця да анімалістычных матываў. Абстракцыя, палоскі, гарох, геаметрыя, літары, кветкі і блакітныя марскія пейзажы — мода вітае ўсё.

Нараўне з гэтым буйствам фарбаў у пляжнай модзе пануе ***мінімалізм***: плаўныя лініі, прастата крою, адсутнасць размернасцяў. Апроч манахрому, самыя актуальныя колеры купальнікаў гэтага лета — сіні і зялёны (ад колеру марской хвалі да бірузы, таямнічага цёмна-зялёнага і сіня-чорнага). Дарэчы, злітны купальнік у стылі мінімалізм цалкам можна ўпісаць у гарадскі вобраз у якасці бодзі. А часам і верх ад раздзельнага — у якасці топа, надзеўшы наверх шырокую кашулю або лёгкі піжжак-аверсайз.

Але ўсё гэта не нова — у тых ці іншых варыянтах і камбінацыях такое мы ўжо бачылі. А вось што стала навінкай менавіта апошніх пляжных сезонаў — дык гэта купальнікі ***з тэкстурнай тканіны***: сірсакера, інших варыянтаў ціснутай тканіны. Фактура матэрыялу забяспечвае ідэальную пасадку на любую фігуру. Трэнд супермодны, застанецца з намі яшчэ на некалькі сезонаў, так што можна смела купляць і фарсіць.

Яшчэ адзін новы трэнд — купальнікі... ***з вышыўкай***. Яна можа быць выканана як на машынцы, так і ўручную і дадасць вобразу вытанчанасці, сцвярджаюць дызайнеры. Актуальныя ***металічныя ўпрыгажэнні*** для купальнікаў (у прыватнасці буйныя кольцы), а таксама доўгія завязкі — як тонкая шнуроўка, так і шырокія стужкі. Завязкі, дарэчы, даюць шырокае поле для эксперыментаў і стварэння самых розных камбінацый.

Злітны купальнік зробіць неверагодна актуальным ***глыбокі V-падобны выраз***. Часам аж да талій. Не надта зручна, затое прыгожа і страйніць, падкрэсліваючы грудзі і зрокава звужаючы стан.

Што да колераў, «адвечныя» чорны і белы, а таксама сіняя і зялёная гама — зусім не аксіёма. Па-ранейшаму прыхільная пляжная мода да каралавай гамы, у трэндзе барві, гарчычны, лавандавы, мятны, аліўкавы. Таксама на грэбні модных хвалі ***nude-style***. Купальнікі бэжавага, далікатна-ружовага, карамельнага, пудравага, цялеснага колераў візуальна робяць вас маладзейшай. Тут галоўнае — правільна падабрацца тон купальніка пад тон скуры. Стылісты раяць выбіраць колер «нюдавага» купальніка на два тоны святлей або цямней за ўласную скуру.

Раздзельны купальнік становіцца ўсё больш сціплым.

БУДЗЕМ АБ'ЕКТЫЎНЫЯ

Мода модай, але ёсць яшчэ важнае пытанне супадзення трэндаў і асаблівасцяў постаці. Як вядома, тыпаў жаночай постаці існуе пяць. Іх прынята пазначаць літарамі: А — шырокія сцёгны пры вузкіх плячах (так бы мовіць, тып «груша»); Т — адваротны варыянт: плечы шырокія, а сцёгны вузкія (так званая спартыўная постаць); Х — яна ж «пясочны гадзіннік»; О — нявыяраженая талія пры тонкіх нагах і руках, у нагрузку — схільнасць да пайнаты (у народзе такі тып называюць «яблык»); Н — памер бюста, сцёгнаў і таліі супадае.

Для фігуры ***тыпу А*** стылісты раяць зрабіць акцэнт на «верх» купальніка, каб візуальна ўраўнаважыць верх і ніз. Выбіраем яркі бюст з прынтамі альбо з тэкстурнай тканіны, а «ніз» — цёмны, гладкі і мінімалістычны. Верх можа быць формы бандо (без брэтэлек) — тады акцэнт будзе зроблены на плячах.

Постаць Т выйграе пры асіметрычным выразнэнні «верха» купальніка — цяпер, дарэчы, варыянтаў асіметрыі маса. Вітаюцца таксама шырокія шлеі або модны V-падобны выраз. Добрая ідэя для нізкай часткі купальніка, напрыклад, — «плавальныя» шорты. Ну, ці плаўкі з цяпер модным завязкамі па баках.

З фігурай ***тыпу Х*** праблем не ўзнікае: гэта «стандарт Галівуду», і яго ўладальніцам застаецца толькі пазайздросціць. У еўрапейскіх краінах такіх «райскіх птушак» водзіцца мала (у большай ступені «гарачыя» формы характэрныя для паўднёвага клімату — напрыклад, для краін Лацінскай Амерыкі). Ну, а тым, каму такая фігура дасталася, рэкамендуецца выбіраць купальніка варта толькі памятаць, што апроч неязмной прыгажосці гарнітур павінен быць яшчэ і зручным, бо ў ім трэба рухацца: плаваць ці, быць можа, гуляць у пляжны валейбол, а не толькі кінематаграфічна ляжаць у шэзлонгу.

Тып О — самы складаны пры выбары купальніка і, на жаль, самы распаўсюджаны ў нашых шыротах. Першае правіла: выбіраем тканіну без бляску, бо ён падкрэсліць акругласці, а нам гэтага не трэба. Правіла другое: занадта светлыя адценні не нашы, калі гаворка аб купальніку: цёмнае страйніць, гэта аксіёма. А вось што наша, дык гэта вертыкальныя палосы, швы, усё той жа V-падобны выраз. Не забываемся, што вярх павінен быць не бясформенны, а шчыльны і з «костачкамі», каб добра падтрымліваць грудзі. Калі казаць аб нізе, то ідэальны варыянт —